Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניקט זיך!
Proletariusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

ЧАЦЬВЕР
23 ліпеня 1931 г.
№ 167 (3256)

ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ПАРТЫІ ДРУЖНА ЗА РАБОТУ!

Другі ўсебеларускі зьезд рабселькораў, ударнікаў бальшавіцкага друку праходзіў пад знакам рэалізацыі баявых дырэктыў партыі па пытаньні перабудовы рабселькораўскага руху тварам да сацыялістычнага будаўніцтва. Лёзунг партыі—«кожны рабселькор—ударнік, кожны ўдарнік—рабселькор»—знайшоў свой адбітак у рабоце зьезду. Зьезд унёс рашучы пералом у справу перабудовы рабселькораўскага руху па ўдарныя рэйкі, і паклаў пачатак штодзённай і сыстэматычнай работы партарганізацый кіраўніцтва рабселькораўскім рухам і нізавым друкам.

Высокая палітычная актыўнасьць, строгая дзелавітасьць, непарушная воля барацьбы за генэральную лінію партыі, барацьбы супроць усякіх ухілаў—вось характарная аднака зьезду. Зьезд зьявіўся трыбунай абмену вопытам у справе рэалізацыі дырэктыў партыі аб рабселькораўскім руху. У рабоце зьезду прымаў самы найактыўнейшы ўдзел загадчык сэктару друку ўсеКП(б) тав. ГУСЕЎ, які ў сваім выступленьні разгарнуў баявую праграму дзейнасьці рабселькораў і друку на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва. Прадстаўнік Ц. О. «Праўды», дэлегацыі рабселькораў УССР і Заходняй вобласьці з трыбуны зьезду падзяліліся вопытам праробленай работы па перабудове рабселькораўскага руху. Зьезд прайшоў пры актыўным удзеле гаспадарнікаў, спэцыялістаў розных галін прамысловасьці і сельскае гаспадаркі. Усё гэта сьведчыць аб тэй вялікай увазе, якая была адведзена зьезду з боку ўсёй савецкай грамадзкасьці, з боку ўсёй партыі.

Другі ўсебеларускі зьезд рабселькораў і ваенкораў прайшоў як зьезд рэканструкцыйнага пэрыяду, пэрыяду разгорнутага наступленьня па ўсім фронце на капіталістычныя элемэнты. Зьезд прыняў грунтоўныя і практычныя рашэньні па рашаючых вучастках работы рабселькораў. Гэтыя рашэньні зьяўляюцца баявой праграмай дзейнасьці ўсёй рабселькораўскай армі. Гэтая баявая праграма павінна быць зараз-жа даведзена да кожнага рабселькора, да кожнага рабочага, калгасьніка, бедняка і серадняка-аднаасобніка. Партарганізацыі, якія нясуць непасрэдную адказнасьць за работу сярод рабселькораў, павінны забясьпечыць сапраўдную і баявую рэалізацыю рашэньняў зьезду і гэты вучастак работы паставіць у асяродак сваёй увагі.

Кожная пастанова, кожнае рашэньне ўсебеларускага зьезду рабселькораў падначалены асноўнай задачы—максымальнага падвышэньня ролі рабселькораў і друку ў барацьбе за перамогу сацыялізму. Партарганізацыі павінны мабілізаваць шырокія рабочыя, калгасныя і бядняцка-серадняцкія масы, усю рабселькораўскую армію на неадкладнае і рашучае ажыцьцяўленьне ўсіх пастаноў і рашэньняў зьезду. Трэба дабіцца таго, каб тыя мэтады і тэмпы, якімі працаваў зьезд рабселькораў, былі перанесены і замацаваны ў практычнай дзейнасьці рабселькораў і ўсяго нашага друку. Як у час самай падрыхтоўкі да зьезду, так і асабліва зараз партарганізацыі, органы кантрольных камісій павінны стаць на чале далейшага разгортваньня рабселькораўскага руху ў адпаведнасьці з пастановамі ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б.

Пасьпяховасьць у справе практычнай рэалізацыі пастаноў і рашэньняў зьезду ў значнай меры залежыць ад таго, наколькі хутка яны будуць абгаворваны ўсёй рабселькораўскай арміяй, наколькі яны хутка будуць даведзены да шырокіх працоўных мас. Таму рашэньні і пастановы зьезду павінны быць абгаворваны на адкрытых сходах партячэек, на сходах рабочых, калгаснікаў, беднякоў і сераднякоў. Трэба неадкладна правесьці зьлёты рабселькораў аднолькавых прафэсій, на якіх павінны быць прапрацаваны рэзалюцыі адпаведных сэкцый усебеларускага зьезду рабселькораў. Распрацоўка рэзалюцый зьезду па паасобных вучастках работы павінна прайсьці пад знакам далейшага разгортваньня ўдарніцтва ў друку, пад знакам высоўваньня і прыняцьця практычных прапаноў у парадку самаабавязацельстваў, якія-б забясьпечвалі хутчэйшае і лепшае ажыцьцяўленьне ўсіх рашэньняў і пастаноў зьезду, дырэктыў партыі па пытаньні аб рабселькораўскім руху.

Прапрацоўка рэзалюцый сэкцый зьезду рабселькораў павінен быць пакладзены пачатак канкрэтызацыі работы з рабселькорамі. Ажыцьцяўляючы канкрэтызацыю работы нізавога і раённага друку, работы сярод рабселькораў, трэба не паслабляць, а з усёй рашучасьцю весьці барацьбу з праявамі дзялянства і апалітычнасьці, што мае месца ў паасобных нізавых газэтах і сярод асобных рабселькораў. Трэба з усёй рашучасьцю біць па бюракратах, зажымшчыках самакрытыкі, магільшчыках рабселькораўскіх допісаў. Барацьба на два фронты, барацьба супроць правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, «левых» загібаў, далейшае разгортваньне нізавога друку, друку на мовах нацменшасьцяў, падвышэньне ўдзелу друку і рабселькораў у справе ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны—ёсьць неабходнейшая ўмова для пасьпяховага ажыцьцяўленьня задач, якія перад рабселькорамі і друкам пастаўлены партыяй.

Пастанова зьезду аб сацспаборніцтве рабселькораў і друку БССР і УССР набывае асабліва важнае палітычнае значэньне. Задача сацспаборніцтва—хуткае і поўнае ажыцьцяўленьне пастаноў ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б, усесаюзнай нарады па пытаньнях рабселькораўскага руху пры «Правде» і пастаноў усебеларускага зьезду рабселькораў. Гэтае сацспаборніцтва павінна быць скарыстана як магутнейшы сродак у справе ўздыму рабселькораўскага руху на вышэйшую ступень, у справе мабілізацыі мас на ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі аб перабудове рабселькораўскага руху ў адпаведнасьці з задачамі сацыялістычнага будаўніцтва. У гэтым сацспаборніцтве павінны прыняць самы найактыўнейшы ўдзел ўсе рабселькоры і ўвесь друк БССР. Уцягнуць у гэтае сацспаборніцтва шырокія масы рабочых, калгаснікаў, беднякоў і сераднякоў—баявая задача.

Выкананьне і перавыкананьне баявой праграмы трэцяга рашаючага—баявая задача. Друк у справе заканчэньня завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў нашай краіне, у справе далейшага разгортваньня суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі на яе аснове кулацтва як класы, у справе практычнай рэалізацыі дырэктыў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б па рашаючым вучастках гаспадарчае работы, у справе ажыцьцяўленьня высунутых задач тав. Сталіным у сваёй прамове на нарадзе гаспадарнікаў, зьяўляецца «самай моцнай, самай вострай зброяй». Гэта абавязвае друк, пачынаючы ад насьценгазэты і канчаючы цэнтральнымі газэтамі, узьняць свой удзел у барацьбе за перамогу сацыялізму.

РАБСЕЛЬКОРЫ! Пад кіраўніцтвам партыі, дружна за работу!

Аб масавай прапрацоўцы пастаноў другога ўсебеларускага зьезду рабсельваенкораў

(Пастанова Сакратарыяту ЦК КП(б)Б)

1. Лічыць неабходным забясьпечыць масавую прапрацоўку вынікаў і пастаноў другога Ўсебеларускага зьезду рабсельваенкораў сярод шырокай масы рабочых, калгаснікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства БССР, надаўшы гэтай прапрацоўцы характар адказнапалітычнай кампаніі.

Прапрацоўку пастаноў зьезду неабходна арганічна ўвязаць з яшчэ большай мабілізацыяй актыўнасьці мас на выкананьне асноўных гаспадарча-палітычных задач у асаблівасьці падрыхтоўкі і правядзеньня ўборачнай кампаніі, ліквідацыі прарыву ў выкананьні промфінпляну ў прыватнасьці па тарфаздабычы і г. д.

Прапрацоўка вынікаў пастаноў зьезду павінна быць адзначана стварэньнем новых насьценных газэт, узмацненьнем існуючых, поўнага выкананьня разьвёрсткі на газэтнае аддзяленьне (камвузу, саўпартшколы, палітасьветтэхнікумы і пэдагагічнага інстытуту), ператварэньнем брыгад друку ў вядучае зьвяно рабселькораўскага руху, завастрэньнем увагі да сыстэматычнай работы з рабселькорамі-адзіночкамі, выкананьнем насьценнымі газэтамі сваёй задачы, як калектыўнага рабкора цэнтральных і раённых газэт і г. д.

а) Даклады аб выніках зьезду заслухаць на агульна-гарадзкіх і раённых сходах партыйнага актыву на адкрытых сходах партыйных і камсамольскіх ячэек, а таксама на сходах прафэсыянальнага і камсамольскага актыву.

б) На спэцыялізаваных сходах рабселькораў разам з рабочымі і калгаснікамі (па групах вядучых прафэсый, па групах жывёлагадоўчых, па групах льнаводных саўгасаў і калгасаў і г. д.) прапрацаваць пастановы адпаведных сэкцый зьезду. Забясьпечыць удзел у прапрацоўцы спэцыялістаў, гаспадарнікаў і прафработнікаў.

в) У час кампаніі прапрацоўкі вынікаў зьезду неабходна арганізацыйна замацаваць умову з друкам і рабселькорамі УССР аб сацыялістычным спаборніцтве на поўнае і найбольш хуткае ажыцьцяўленьне пастановы ЦК УсеКП(б) ад 16-га красавіка 1931 г., пастанаву Ўсесаюзнай нарады пры «Правде» і 2-га Ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

г) У лютым м. 1932 году разам з ЦКК КП(б)Б правесьці Ўсебеларускі месячнік масавага агляду самаправеркі выкананьня пастановы ЦК УсеКП(б) ад 16-га красавіка, пастаноў Усебеларускага зьезду рабселькораў і Усесаюзнай нарады пры «Правде».

Кіраўніцтву Камвузу імя Леніна, Ўсебеларускай саўпартшколе і палітасьветтэхнікуму—удасканаліць тэрміны прахаджэньня навучальнай праграмы газэтных аддзяленьняў,—выходзячы з таго, што ў лютым мес. 1932 г. студэнты газэтных аддзяленьняў будуць накіраваны на месяц у раёны БССР для дапамогі партарганізацыям у правядзеньні масавага агляду самаправеркі.

д) Прапрацаваць пастановы Ўсебеларускага зьезду рабселькораў і Ўсесаюзнай нарады пры «Правде» ва ўсіх зьвеньнях сыстэмы партыйнай і камсамольскай асьветы.

Культпропу ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ даць аб гэтым адпаведныя паказаньні.

2. На працягу бліжэйшых месяцаў заслухаць на паседжаньні бюро і сакратарыяту ЦК КП(б)Б даклады некалькіх райкомаў і гаркомаў КП(б)Б аб выкананьні пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб перабудове рабселькораўскага руху нізавых газэт і ўзмацненьні партыйнага кіраўніцтва гэтым вучасткам работы.

3. Абавязаць БДВ пад адказнасьць т. т. Некрашэвіча і Брэнэйзіна ў дэкадны тэрмін выдаць масавым тыражом зборнік пастаноў Усебеларускага зьезду рабселькораў.

4. Абавязаць рэдакцыі цэнтральных і раённых шматтыражак і насьценных газэт зьмяшчаць сталыя аддзелы па пытаньнях барацьбы за ажыцьцяўленьне пастаноў Усебеларускага зьезду рабселькораў.

Перыядычна праводзіць апэрацыйна-масавую работу (рэйды, нарады і г. д.) па праверцы выкананьня пастаноў зьезду і ў асаблівасьці пастаноў тэй сэкцыі, якой у час зьезду кіравала адпаведная цэнтральная альбо раённая газэта.

Усім ГК і РК КП(б)Б

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б завастрае асаблівую ўвагу ўсёй КП(б)Б, усіх гарадзкіх і раённых камітэтаў КП(б)Б на неабходнасьці забясьпечыць сыстэматычнае, глыбокае замацаваньне і далейшае разгортваньне тэй работы па перабудове рабселькораўскага руху і нізавога друку, якая была праведзена ў час падрыхтоўкі да Ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

ДАБІЦЦА РАШУЧАГА ПЕРАЛОМУ Ў РАБСЕЛЬКОРАЎСКІМ РУХУ, АЖЫЦЬЦЯВІЦЬ ЯГО ПЕРАБУДОВУ Ў СУАДПАВЕДНАСЬЦІ З ПАСТАНОВАЮ ЦК УсеКП(б) АД 16-га КРАСАВІКА 1931 г. І ЎЗМАЦНІЦЬ СЫСТЭМАТЫЧНАЕ ПАРТЫЙНАЕ КІРАЎНІЦТВА НІЗАВЫМ ДРУКАМ І РАБСЕЛЬКОРАЎСКІМ РУХАМ, ЯК АДНЫМ З ВАЖНЕЙШЫХ ВУЧАСТКАЎ АГУЛЬНА-ПАРТЫЙНАЙ РАБОТЫ—АДНА З ПЕРШАЧАРГОВЫХ ЗАДАЧ УСЁЙ КП(б)Б.

У прыватнасьці неабходна безадкладна выканаць наказаньне ЦК УсеКП(б) аб тым, што «для кіраўніцтва рабселькорамі і нізавым друкам пры парткамітэтах павінны быць створаны камісіі ў складзе загадчыка культпропаддзелу, рэдактара газэты, прадстаўніка РСІ, пракуратуры і інструктара па друку, а пры культпропах буйнейшых РК вылучаны інструктары друку».

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б ускладае на раённыя і гарадзкія камітэты КП(б)Б непасрэдную адказнасьць за арганізацыю масавай прапрацоўкі і кіраўніцтва практычным ажыцьцяўленьнем пастановы ЦК УсеКП(б) аб перабудове рабселькораўскага руху і прынятых на падставе гэтага дакуманту пастаноў 2-га Ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

Сакратар Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б ГЕЙ
Загадчык культпропу ЦК КП(б)Б ЧАРНУШЭВІЧ.

Даклад рэдактара ЦО „Зьвязда“ т. Будзінскага на другім усебеларускім зьезьдзе рабсельваенкораў будзе надрукаваны ў заўтрашнім нумары.

СУПРОЦЬ НОВЫХ ЛАНЦУГОЎ ІМПЭРЫЯЛІЗМУ

СУПРОЦЬ ПАНАВАНЬНЯ КАПІТАЛУ

ЎЗЬНІМАЮЦЦА МІЛЬЁНЫ ПРАЦОЎНЫХ МАС НЯМЕЧЧЫНЫ

Пад кіраўніцтвам кампартыі супроць голаду і наступленьня прадпрыемцаў

Магутная хваля забастовак у Нямеччыне

БЭРЛІН. Амаль на ўсіх заводах і фабрыках Нямеччыны прадпрыемцы ў сувязі з фінансавым крызісам ня выплачваюць зарплаты і скарочваюць яе, а ў радзе выпадкаў і спыняюць работу.

Рабочыя заводу Бэргман у Эрфурце у адказ на невыплату заработку абвясьцілі забастоўку. У Дусэльдорфе адбылася канфэрэнцыя працоўных жанчын, у якой удзельнічала 100 дэлегатаў. Сярод іх адна сацыял-дэмакратка, 21 камуністка, іншыя—беспартыйныя. Канфэрэнцыя прыняла рэзалюцыю аб неабходнасьці змагацца пад кіраўніцтвам кампартыі супроць голаду і наступленьня прадпрыемцаў.

„Дырэктар“ Астроўскі ў сапраўднай ролі шпіёна

ВІЛЬНЯ. 21-VII. Віленскі друк паведамляе, што 17-га ліпеня адбыўся ў акруговым Віленскім судзе суд над былым вучнем Віленскай беларускай гімназіі Панасам па абвінавачаньні ў прыналежнасьці да камуністычнага саюзу моладзі Заходняй Беларусі.

У якасьці сьведкі па абвінавачаньні Панаса ў камуністычнай дзейнасьці на судзе выступіў вядомы нацыянал-фашыст Астроўскі—дырэктар Віленскай беларускай гімназіі.

Астроўскі разам з іншымі тайнымі агентамі дэфэнзывы даводзіў фашысцкаму суду, што Панас яшчэ будучы вучнем Віленскай беларускай гімназіі, ім, Астроўскім, быў западазроны ў сувязі з камуністычным саюзам моладзі Заходняй Беларусі, (аб чым ён бязумоўна інфармаваў адпаведныя органы яшчэ да арышту Панаса).

Агент дэфэнзывы, нацыянал-фашыст Астроўскі, яшчэ раз паказаў сябе як сапраўднага служку, даносчыка, лёкая польскага фашызму. Яго выступленьне на судзе пры «закрытых дзьвярох» дішні раз паказвае перад працоўнымі масамі Заходняй Беларусі сапраўдны твар, сапраўдную ролю нацыянал-фашыста.

Працоўныя масы Заходняй Беларусі належным чынам ацэняць гэты факт здраднікa, шпіёна і даносчыка і зпуртаваўшыся на сьцягам камуністычнай партыі будуць весьці рашучую барацьбу з польскім фашызмам і яго лёкаямі беларускімі нацыянал-фашыстамі.

Паліцэйскі паход на камуністычны друк у Нямеччыне

БЭРЛІН. Паліцэй-прэзыдэнт забараніў камуністычны штотыднёвік «Абэрляўзіц», «Беспрацоўны» і яго правінцыяльныя выданьні, а таксама газэту «Ротэр Руфэр». У Мэкленбурзе ўлада забараніла на 4 тыдні орган кампартыі Мэкленбурга.

Банкруцтвы ў Нямеччыне пашыраюцца

БЭРЛІН. Пасьля раду спробаў аздаравіць буйны тэкстыльны канцэрн у Нямеччыне «Нордволе» ў Рэмэне, фірма абвешчана абанкрочанай. Узьникла непасрэдная пагроза звальненьня 25.000 рабочых і служачых.

Апазыцыйныя манэўры нямецкага фашызму

БЭРЛІН. Правадыр партыі нацыянал-сацыялістаў (фашыстаў) Гітлер, правадыр нацыяналістычнай партыі Гугенбэрг, кіраўнік «стальнога шлему» ў Зэльдцы і Дзюстэрбэрг і кіраўнік кулацкай партыі ляндбунду граф Калькрэйт паслалі тэлеграму рэйхсканцлеру Брунінгу ў Лёндан, пратэстуючы супроць таго, што цяпер Францыя ўжо адкрыта выяўляе намеры назаўсёды прытнечваць нямецкі народ.

«Нацыянальная апазыцыя — гаворыцца ў тэлеграме,—ніякім чынам, ня будзе лічыць для сябе абавязковым і зробленыя Брунінгам уступкі ў адносінах да Францыі».

Паніка ўкладчыкаў у Нямеччыне разрастаецца

БЭРЛІН. Перад аддзяленьнямі банкаў і кас ашчаднасьці зноў наглядаецца вялікае скапленьне ўкладчыкаў, асабліва рабочых у раёнах Бэрліну.

Характэрна, што гэты новы напор на банкі і касы ашчаднасьці наглядаецца ўжо пасьля ўвядзеньня надзвычайнага дэкрэту, які дазваляе кожнаму ўкладчыку атрымліваць ня больш 20 марак.

Перад ударам...



Налёт паліцыі на ЦК кампартыі Нямеччыны

БЭРЛІН, 21-VII. Сёньня пасьля абеду паліцыя заняла дом ЦК нямецкай кампартыі. Учынен дакладны вобыск. Двое арыштавана, у тым ліку адзін дэпутат ляндтагу. Паліцыя канфіскавала некалькі сот брашур і газэт.

70-тысячная забастоўка тэкстыльшчыкаў у Бразіліі

НЬЮ-ЁРК, 21-VII. Паводле паведамленьня з Бразіліі, у Сант-Паола бастуе 70 тысяч тэкстыльшчыкаў, патрабуючых падвышэньня заработку, 8-гадзіннага рабочага дню і забароны дзіцячай працы.

У Калёне (Панама) усеагульная забастоўка. Рабочыя патрабуюць падвышэньня заработку і 8-гадзіннага рабочага дню. Адбыліся магутныя дэманстрацыі.

Крывавыя бойкі забастоўшчыкаў з паліцыяй у Гішпаніі

ПАРЫЖ. У Сэвільлі пачалі курсаваць трамваі, суправаджаемыя салдатамі і пад аховай паліцыі. Стачачнікі нападалі на трамваі, але былі адбіты суправаджаўшай іх аховай.

Параненa, паводле афіцыйных даных, 15 чалавек, у большасьці выпадкаў цяжка. У сапраўднасьці лік параненых значна большы, бо многа параненых перанесена на свае кватэры. Арыштавана 130 чал. Учынена шмат вобыскаў. Агенцтва Гавас паведамляе падрабязнасьці аб сутычках паміж жандармэрыяй і стачачнікамі ў Сэвільлі. Забастоўшчыкі з вокнаў суседніх дамоў стралялі ў жандараў, пасьля чаго спрабавалі атакаваць паліцэйскія казармы, але былі адбіты. Былі прысланы атрады пяхоты, якія залпамі абстрэльвалі стачачнікаў.

***

МАДРЫД. На паседжаньні ўстаноўчага збору дэпутат Франк выступіў з абвінавачаньнем па адрасу гішпанскага ўраду ў фальсіфікацыі выбараў у Сэвільлі. Выступіўшы з адказам міністр унутраных спраў Маўра абвінавачваў Франка ў рэвалюцыйнай і анархісцкай дзейнасьці. Установчы збор вялізарнай большасьцю галасоў адобрыў выступленьне Маўра.

***

МАДРЫД. Орган гішпанскіх банкіраў «Фінанс'ер» зьмяшчае артыкул, у якім выказваецца ў тым сэнсе, што ўдзел сацыялістаў ва ўрадзе шкодны, бо яны дзякуючы гэтаму трацяць уплыў у масах. Сацыялісты павінны заставацца ў апазыцыі, бо сацыялістычная апазыцыя зможа лепш падтрымаць рэспубліку.

Самазабойствы ў Нямеччыне

БЭРЛІН. Самазабойствы ў Нямеччыне пачынаюць набываць эпізадычны характар. Так, у вёсцы Олеиштэце каля Брэмэна, селянін, маёмасьць якога павінна была быць прадана з таргоў, падпаліў сваю хату.

У агні, апроч селяніна, загінула 4 яго дзяцей. У Кельне беспрацоўны, які мае пяцёра дзяцей, кінуўся ў Рэйн, яго ўдалося адратаваць. У больніцы ён заявіў, што 10 дзён галадаў і далей такога жыцьця вытрымаць ня мог. У той-жа дзень у Рэйн кінуўся 15-гадовы рабочы падлетак, які ня мог сабе знайсьці работы і ўжо некалькі дзён галадаў.

Напярэдадні 1 жніўня—дню барацьбы супроць імпэрыялістычных войн

У Францыі

ПАРЫЖ. Орган камсамолу Францыі «Авангард» апублікаваў адозву, у якой заклікае рабочую моладзь выступіць 1-га жніўня на заводах і фабрыках супроць імпэрыялістычнай вайны, супроць наступленьня капіталістаў на зарплату, супроць прасьледваньняў рэвалюцыйных рабочых і салдат, супроць голаду, які рыхтуе буржуазія для працоўных мас.

Адозва заклікае рабочую моладзь выступіць у абарону Савецкага Саюзу, за вызваленьне зьняволеных рабочых і салдат, у абарону органа саюзу моладзі «Авангард».

Адозва прапануе арганізаваць 1-га жніўня забастоўкі, мітынгі ля брамаў прадпрыемстваў і вулічныя дэманстрацыі, якія павінны зьявіцца падрыхтоўкай да 17-га міжнароднага юнацкага дню. Да гэтага дню прыстасавана паездка ў СССР дэлегацыі рабочай моладзі.

«Юманітэ» паведамляе, што францускія імпэрыялісты вядуць новыя буйныя ваенныя дзеяньні, маючыя мэтай падначаліць плямёны вялікага Атласу. Апэрацыі пачаліся некалькі месяцаў назад супольнымі сіламі пяхоты, танкаў і авіяцыі. «Уціхамірэньне раёну неабходна францускаму імпэрыялізму з прычыны таго, што непакорлівыя плямёны зьяўляюцца пагрозай для будучай француска-сахарскай чыгункі».

Уборачную эстафэту Саветаў — на поўны ход

Ігнараваньне зьдзельшчыны і вучоту—

галоўныя тормазы пасьпяховага сканчэньня сенаўборачнай і разгортваньня ўборкі ўраджаю

Да суровай адказнасьці апартуністаў з калгасаў „Новы Шлях“, „Чырвоны Маяк“, імя Сталіна, якія зрываюць дырэктывы партыі і ўраду аб зьдзельшчыне. ■ Праз уборачную эстафэту саветаў мабілізуем шырокія масы і ліквідуем ганебны прарыў на фронце сенаўборачнай

Ельшчына ўключылася ва ўборачную эстафэту саветаў

(Ад нашага карэспандэнта па тэлефону)

ЕЛЬСК. Пашыраны пленум РК КП(б)Б абмеркаваў пытаньні ходу ўборачнай кампаніі. Пленум пастанавіў уключыцца ва ўборачную эстафэту саветаў па ўсіх маршрутах.

Рашэньне РК КП(б)Б першым падхапіў Ельскі сельсавет, які ўжо ўключыўся ва ўборачную эстафэту. Ельскі сельсавет ставіць сваёй мэтай давесьці ўборачную эстафэту да кожнага члена сельсавету, калгасьніка-ўдарніка, да кожнага бедняка і серадняка-аднаасобніка.

26-га ліпеня будуць падагулены вынікі работы прэзыдыўму сельсавету па правядзеньні ўборачнай эстафэты. Ельскі сельсавет выклікаў уключыцца ў эстафэту іншыя сельсаветы і раёны.

Для правядзеньня маршрутаў уборачнай эстафэты арганізуецца 208 ударных брыгад, у работу якіх будзе прыцягнута 168 актывістаў—членаў сельсаветаў, 375 членаў праўленьняў калгасаў і калгасьнікаў-ударнікаў. Уцягваецца таксама ўся рабселькорыя раёну.

Герасіменка.

З фронту ўборкі

Больш 20 раёнаў БССР інтэнсыўна ўзяліся за ўборку ўраджаю, Хойніцкі раён ужо зжаў 4608 га вбожжа, з іх жыта: калгасы—891 га, аднаасобнікі—2577 га, ярыны: калгасы—276 га, аднаасобнікі 864 га.

Нараўлянскі раён: калгасы зжалі жыта 526 га, аднаасобнікі—787 га; ярыны калгасы—48 га, аднаасобнікі—497 га.

Церахоўскі раён: жыта зжата ў калгасах—110 га, аднаасобнікаў—508 га; ярыны калгасы—10 га, аднаасобнікі—109 га.

Лельчыцкі: жыта—калгасы 422 га, аднаасобнікі—198 га.

Жыткавіцкі: жыта—калгасы 158 га, аднаасобнікі 287 га.

Любаньскі: калгасы—25 га, аднаасобнікі 40 га.

Буда-Кашалёўскі: калгасы—30 га, аднаасобнікі—80 га; ярыны аднаасобнікі—20 га.

Веткаўскі: калгасы—30 га, аднаасобнікі—257 га.

На барацьбу са стратамі пры ўборцы ўраджаю

Пастанова ЦКК-НК-РСІ БССР аб масавых мерапрыемствах па барацьбе са стратамі

Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б і Калегія НК-БССР пастанавілі:

Запрапанаваць НКЗ, Белкалгасцэнтру, Белсаўгастрэсту і Трактарацэнтру неадкладна давесьці да саўгасаў, калгасаў і паасобнага двара мерапрыемствы, прынятыя Калегіяй НК-РСІ СССР ад 11 ліпеня 1931 году (зьмешчаны ў газ. «Социалистическое Земледелие») аб масавых мерапрыемствах па барацьбе са стратамі пры ўборцы збожжавых культур. Даручыць раённым і гарадзкім КК-РСІ арганізаваць на ўвесь пэрыяд уборкі ўраджаю камісіі па барацьбе са стратамі. Камісіі складаюцца з прадстаўнікаў саветаў, мясцовага друку, ЛКСМБ, калгассаюзу, МТС, ударнікаў саўгасаў і калгасаў пад кіраўніцтвам старшынь райКК-РСІ. Камісіі павінны весьці актыўную барацьбу за разгортваньне масавых мерапрыемстваў па барацьбе са стратамі.

С.-г. групе РСІ даручаецца правяраць праз тыдзень выкананьне гэтай пастановы цэнтральнымі ўстановамі.

МТС выканалі плян сенаўборкі на 65,1 проц.

Зводка ходу сенаўборкі па лініі МТС на 20 ліпеня

НАЗВА МТС	Плян	Скошана	Проц. вык.
Ветрынская	3 218	2.325	72,2
Асьвейская	5 014	2.599	51,8
Лёзьненская	6.450	5.121	79,4
Сіроцінская	5.512	1 000	18,1
Горацкая	6 066	3.683	60,7
Мсьціслаўская	5 828	3 862	66,3
Лепельская	7.452	3.488	46,8
Шклоўская	4.273	3 277	76,8
Гарадоцкая	4 402	2.371	55,1
Расонская	1.790	1.141	63,8
Сененская	6.728	3 170	47,1
Вушацкая	5.336	3 902	73,1
Дубровенская	3.890	2.215	56,9
Койданаўская	10·290	9 843	95,7
Заслаўская	5.736	4.279	92—
Капыльская	3.963	3.608	93,6
Танеская	6.577	2 335	35,5
Смалявіцкая	2.273	2 340	102,1
Случкая	6.207	3 331	51,2
Клімавіцкая	8.221	6 600	77,8
Церахаўская	4 354	3 216	73,9
Старадароская	1.770	2 150	121—
Жыткавіцкая	12.000	9 100	76,7
Менская	2 617	2 686	102,6
Дрысенская	3.869	1.170	30,2
Касьцюковіцкая	6.559	2.486	33,6
Боркавіцкая	4 842	3.787	78,9
Разам	145.918	94.985	65,1

Калгас „Чырвоны маяк“ ігнаруе зьдзельшчыну

У калгасе «Чырвоны Маяк» Максімавіцкага сельсавету, Клічаўскага раёну, яшчэ да гэтага часу ня ўведзена зьдзельшчына. Праўленьне калгасу чамусьці ігнаруе зьдзельшчыну, ставіць яе на другі плян. Часта бываюць выпадкі, калі самі калгасьнікі прыходзяць да старшыні і просяць, каб у калгасе хутчэй ўвесьці зьдзельшчыну. Старшыня калгасу заўсёды адказвае: «да ўборачнай кампаніі ўвядзем абавязкова».

Уборачная кампанія ўжо пачалася, а зьдзельшчыны няма.

М. Г.

Рэзалюцыя Менскага агульна-гарадзкага сходу партактыву

ПА ДАКЛАДУ ТАВ. БУДЗІНСКАГА АБ ВЫНІКАХ II УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ РАБСЕЛЬВАЕНКОРАЎ.

Заслухаўшы даклад тав. Будзінскага аб выніках другога ўсебеларускага зьезду рабселькораў, Менскі агульна-гарадзкі сход партактыву адзначае: што як работа, так і пастановы зьезду цалкам адпавядаюць ажыцьцяўленьню задач, пастаўленых ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб перабудове рабселькораўскага руху, падкрэсьліваючы ўказаньне XVI зьезду партыі, што:

«Гігантцкія посьпехі партыі ў справе будаўніцтва сацыялізму ў прамысловасьці і сельскай гаспадарцы сталі магчымы толькі на базе вялікай актыўнасьці рабочай клясы і ідучых за ёй працоўных мас, якія выявіліся ў шырокім разьвіцьці сярод рабочых сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, у перабудове работы ўсіх органаў пралетарскай дыктатуры партыйных, прафсаюзных, савецкіх і каапэрацыйных арганізацый пад лёзунгам мабілізацыі мас за бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнай рэканструкцыі краіны, за перамогу цяжкасьцяй, за паварот прафсаюзаў тварам да вытворчасьці і савету, да калгаснага будаўніцтва» (з рэзалюцыі XVI партзьезду па справаздачы ЦК УсеКП(б).

Актыў Менскай гарадзкой арганізацыі адзначае, што гэты вялікі ўздым актыўнасьці мас адбівае рабселькораўскі рух, які перажыў і перажывае паласу бурнага ўздыму і актыўнасьці мас рабселькораў, што знайшло адлюстраваньне ў работах другога ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

Высокая палітычная актыўнасьць делегатаў зьезду, праяўленая ў канкрэтным дзелавым зьместам, была забясьпечана дзякуючы бальшавіцка-правядзенай партарганізацыямі пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б падрыхтоўчай работы да зьезду, дзякуючы перабудове мэтадаў работы самога зьезду, якая ў асноўным праходзіла ў сэкцыях, што дало магчымасьць кожнаму делегату прыняць непасрэдны ўдзел па абгаварэньні і вырашэньні тых канкрэтных задач, якія стаяць перад той галінай народнай гаспадаркі, дзе даны рабселькор працуе.

Зьезд прайшоў, як зьезд рэканструкцыйнага пэрыяду, як зьезд перабудовы рабселькораўскага руху, тварам да канкрэтных задач сацыялістычнага будаўніцтва, пад аднакаю павышэньня ролі рабселькора, які «пад кіраўніцтвам партыі становіцца арганізатарам мас для справы сацыялістычнага будаўніцтва «у барацьбе за пяцігодку ў чатыры гады».

Як падрыхтоўка да зьезду, якая дала вялізарны рост і канкрэтныя дасягненьні ў перабудове рабселькораўскіх радоў і нізавога друку і ўзмацненьне партыйнага кіраўніцтва імі, так і сама работа зьезду, якая падагуліла дасягнутыя посьпехі і дала разгорнутую праграму замацаваньня дасягнутага і далейшай перабудовы для забясьпячэньня канкрэтнага ўдзелу рабселькораў і друку ў фарсаваньні тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, для падняцьця рабселькораўскага руху на яшчэ больш вышэйшую ступень,—усё гэта яшчэ адзін моцны ўдар па права і «лева» апартуністычных спробах адарваць рабселькораўскі рух ад канкрэтных задач сацыялістычнага будаўніцтва, па спробах супроцьпаставіць рабселькораўскі рух і друк партыйнаму кіраўніцтву, што знайшло ў свой час адбітак у выступленьні С. Праўды аб «двойственным» становішчы раённых газэт, рашуча асуджанага ўсёй партарганізацыі і рабселькорамі, пад націскам чаго са значным спазьненьнем ад яе рашуча адмовіўся і сам аўтар.

Агульны сход Менскага гарадзкога партактыву ўхваляе пастанову сакратарыяту ЦК КП(б)Б аб масавай паглыбленай прапрацоўцы вынікаў Усебеларускага зьезду рабселькораў і абавязвае Менскую партарганізацыю ў цэлым кожную парт. ячэйку паасобку выкарыстаць прапрацоўку для замацаваньня і пашырэньня посьпехаў перабудовы рабселькораўскага руху і нізавога друку да яшчэ большага разгортваньня іх і палепшаньня сыстэматычнага парткіраўніцтва ў адпаведнасьці з пастановамі ЦК УсеКП(б)Б, ЦК КП(б)Б і Менскага ГК КП(б)Б.

Прапрацоўка, папуляразацыя пастаноў зьезду рабселькораў праз адкрытыя партсходы, спэцыялізаваныя зьлёты рабселькораў аднародных прафэсій і г. д. з шырокім прыцягненьнем спэцыялістаў гаспадарнікаў і прафработнікаў праз друк павінны быць ператорваны ў масавую палітычную кампанію па мабілізацыі ўвагі ўсёй партарганізацыі, усёй рабочай клясы, калгасьнікаў, бядняцка-серадняцкай масы сялянства і рабселькораў вакол канкрэтнага ажыцьцяўленьня гаспадарча-палітычных задач кожнага прадпрыемства, кожнага калгаса і саўгаса, вакол задач далейшага росту рабселькораўскага руху і нізавога друку па рэалізацыі лёзунгу: «кожны рабселькор—ударнік, кожны ўдарнік—рабселькор», па стварэньні баявых апэрацыйна-насьценных газэт у кожным цэху, у кожнай брыгадзе, саўгасе, калгасе і пераўтварэньні ўдарных брыгад друку ў вядучае зьвяно рабселькораўскага руху і выкананьне насьценнымі газэтамі задач—колектыўных рабкораў цэнтральных і раённых газэт, разам з гэтым трэба не паслабляць ні на адну хвіліну работы сярод рабселькораў—адзіночак, уцягваючы іх ва ўдарныя брыгады друку.

Агульна-гарадзкі сход партыйнага актыву падкрэсьлівае, што ўся партыйная арганізацыя у цэлым, кожная ячэйка паасобку нясе непасрэдную адказнасьць за становішча кіраўніцтва нізавым друкам і рабселькораўскім рухам.

Агульна-гарадзкі сход партыйнага актыву з асабліваю сілаю падкрэсьлівае, што факты адсутнасьці, альбо недастатковасьці колькаснага і якаснага росту нізавых газэт, адсутнасьці, альбо недастатковасьці сыстэматычнага партыйнага кіраўніцтва ў тым ці іншым прадпрыемстве, калгасе, установе і г. д. работаю сярод рабселькораў павінна разглядацца, як прамы сыгнал аб нездавальняючым становішчы справы разгортваньня самакрытыкі і барацьбы за яе дзейственнасьць.

Рэдакцыйны артыкул ЦО УсеКП(б) «Правды» з станоўчай ацэнкай разгорнутай работы партарганізацыі БССР у перабудове рабселькораўскага руху яшчэ больш абавязвае ўсю КП(б)Б і ў прыватнасьці Менскую гарадзкую арганізацыю, як перадавы атрад КП(б)Б, не супакоіцца на дасягнутым, а ўзмацніць непасрэдны ўдзел у завяршэньні перабудовы рабселькораўскага руху і далейшым узмацненьні сыстэматычнага партыйнага кіраўніцтва пад кутом канкрэтызацыі яго.

Менскі агульна-партыйны актыў абавязвае кожную партыйную ячэйку няўхільна і пасьлядоўна ажыцьцяўляць самую настойлівую і жорсткую глыбокую праверку выкананьня ўсіх раней прынятых і прыймаемых пастаноў па пытаньнях нізавога друку і рабселькораўскага руху.

Увага партарганізацыі і друку павінна быць таксама накіравана на забясьпячэньне далейшага росту рабселькораўскіх радоў, насьценных і шматтыражных газэт, на яшчэ большае падвышэньне іх ролі ў барацьбе за генэральную лінію партыі, за ленінскую нацыянальную палітыку супроць правага, найбольш небясьпечнага на даным этапе і «левага» апартунізму і прымірэньства да іх, за бальшавіцкія тэмпы, за поўную і бездакладную рэалізацыю высунутых базавых задач у апошняй прамове правадыра партыі—тав. Сталіна за плян, за праверку выкананьня, за далейшае няўхільнае ўзмацненьне абароназдольнасьці, за ўзмацненьне нізавога друку на мовах нацменшасьцяй, за вярбоўку лепшых «камунстаў—рабселькораў—ударнікаў у газэтныя аддзяленьні, за разгортваньне і падвышэньне дзейнасьці самакрытыкі, а таксама за аднаасобныя глыбокі і разгарнуты сыстэматычны паказ станоўчага ўзору сацыялістычнай працы, за разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, як асноўных мэтадаў штодзённай работы па будаўніцтву сацыялізму.

Партактыў заклікае ўвесь друк і рабселькораў БССР пад кутом рэалізацыі вышэйпералічаных задач, неадкладна прыступіць да выкананьня пастановы зьезду рабселькораў аб сацыялістычным спаборніцтве з друкам і рабселькорамі Украіны.

Няхай жыве рабселькораўскі рух і бальшавіцкі друк БССР, іх кіраўнік КП(б)Б.

Няхай жыве Цэнтральны Камітэт УсеКП(б)—арганізатар і правадыр пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва.

Няхай жыве правадыр партыі т. Сталін!

САУГАСЫ І КАЛГАСЫ!

На перадавыя пазіцыі рэалізацыі пазыкі „3 рашаючы"

Шэфы! Памятайце, што кожная фабрыка, завод, установа адказваюць за посьпех рэалізацыі пазыкі ў калгасе, вёсцы

Усю работу па рэалізацыі пазыкі на вёсцы правесьці непасрэдна ў брыгадах, у полі

(З пастановы Прэзыдыўму ЦСПСБ, ЦК ЛКСМБ, Цэнтральнай Камісіі Садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчадсправе пры ЦВК БССР, Белкалгасцэнтру).

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, энтузіязмам рабочай клясы, разгортваньнем сацыялістычных мэтадаў працы, рэалізавана пазыка «3 рашаючы год пяцігодкі» сярод рабочых і служачых БССР, дасягнуўшы на 15 ліпеня гг., 107,9 проц. заданьня.

Рэалізацыя пазыкі на вёсцы—другі важнейшы этап кампаніі. Па прыкладу гораду кампанія на вёсцы павінна быць праведзена бальшавіцкімі тэмпамі, забясьпечыўшы сканчэньне і поўнае выкананьне заданьня да 1-га жніўня г.г.

Прэзыдыўм ЦСПСБ, ЦК ЛКСМБ, Цэнтральная камісія Садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчадсправе пры ЦВК БССР і праўленьне Белгасцэнтру **пастанаўляюць:**

Правесьці з 20 ліпеня ўдарны дэкадзнік рэалізацыі пазыкі на вёсцы на працягу якога завяршыць і забясьпечыць поўнае выкананьне заданьня па рэалізацыі пазыкі на вёсцы.

На працягу дэкадніка ўсім прафсаюзным ,камсамольскім арганізацыям, усёй сыстэме калгасаў і сыстэме камісій садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчадсправе, усім шэфскім арганізацыям гораду—у цэнтр увагі ўсёй сваёй практычнай работы паставіць рэалізацыю пазыкі на вёсцы.

Усе гэтыя арганізацыі павінны вылучыць спэцыяльныя брыгады па рэалізацыі пазыкі на вёсцы.

Правесьці па ўсіх раёнах куставыя зьлёты сельскіх і калгасных камсодаў і грамадзкіх інструктароў супольна з прафсаюзным, камсамольскім і савецкім актывам і працаўнікамі фінансава-крэдытнага апарату, на якіх абгаварыць канкрэтныя мерапрыемствы правядзеньня дэкадніка на вёсцы.

Усім райкамсодам на працягу дэкадніка правесьці ня менш 3-х выязных паседжаньняў у асобных сельсаветах і калгасах.

Усім камсамольскім ячэйкам вылучыць ня менш аднаго адказнага арганізатара для практычнага ўдзелу ў правядзеньні ўдарнага дэкадніка. Абавязаць кожнага камсамольца завербаваць ня менш 6 падпісчыкаў пазыкі.

Абавязаць гаррайпрафсаветы, РК ЛКСМБ і райкамсоды арганізаваць практычную дапамогу гарадзкіх пралетарскіх арганізацый вёсцы, шляхам абмену вопытам правядзеньня рэалізацыі пазыкі, пасылкі ўдарных брыгад са складу актыву, ударнікаў пазыкі, прэміяваных камсодаў, грамадзкіх інструктароў, прадстаўнікоў райгазэты, рабочых адпускнікоў, студэнцтва і піянэраў.

Кожная фабрыка, кожны завод і ўстанова адказваюць за пасыланую рэалізацыю пазыкі ў падшэфным раёне, вёсцы і калгасе.

Ва ўсёй рабоце па правядзеньні дэкадніка шырока разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж сельсаветамі, калгасамі і саўгасамі і МТС, брыгадамі, калгасьнікамі і бядняцка-серадняцкім сялянствам. Арганізаваць грамадзкі буксір па адстаючых арганізацыях і пасылку асобных брыгад і дэлегацый калгасаў, саўгасаў і МТС, пасыльяхова правёўшых падпіску.

Правесьці растлумачальную работу аб пазыцы сярод аднаасобнікаў, шырока ўжываючы мэтад масавага падворнага абходу аднаасобнікаў. Усю работу па рэалізацыі пазыкі на вёсцы правесьці непасрэдна ў брыгадах, у полі.

ЦСПСБ **Кавалёў.**
ЦК ЛКСМБ **Палякоў.**
Цэнтр. Камісія Садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчадсправе пры ЦВК БССР **Вансоўскі.**
Белкалгасцэнтр **Стрэле.**

Браць прыклад з лепшых, даваць адпор апартуністам

Па Віцебскай прыстані рачнога транспарту рад работнікаў перавыканалі заданьне па падпісцы на пазыку на месяцы заработак. Вось яны: Гарэліч М. П.—качагар замснараду «Оксская 1-я», пры зарплаце 82 руб. падпісаўся на 150 руб.; Вайтушка Е., пам. машыніста таго-ж замснараду, заробляючы 126 руб, падпісаўся на 200 руб.; Малахоўскі С. М., наглядач вадамернага пункту ,пры заработку ў 45 руб., падпісаўся на 100 руб.; Харытовіч К.—дзяжурнік дасьледчай партыі,—зарплата 125 р., падпісаўся на 150 руб.; Дзер гачоў П.—качагар параходу «Валкота», пры зарплаце ў 82 руб. падпісаўся на 135 руб.

Есьць асобы, якія адмовіліся ад падпіскі на пазыку: Чувахоў О.—пам. машыніста п. х. «Вэліса», Дынін А. Я.—матрос лайбы, Сухарукаў А., Вышынскі С., Валодзька Б.—корнікі лайб.

Нельга абыйсьці моўчкі паасобных асоб, якія актыўна процідзейнічалі рэалізацыі пазыкі. З іх найбольш выявіў сябе матрос лайбы № 4 Быліньскі П. Я., які на агульным сходзе каманд лайб №№4—59, па пытаньні рэалізацыі пазыкі выступіў супроць падпіскі са словамі: «з нас усё рвуць, а нічога не даюць, няхай заплацяць па 120 руб. у месяц ,тады будзем падпісвацца», ён наадрэз адмовіўся ад падпіскі і ў выніку сарваў падпіску на двух лайбах, з якіх падпісаўся толькі адзін матрос Багданаў П. М.

Выступіў супроць пазыкі і капітан п. х. «Дзьвіна» Бернацкі Аляксей, прычым падпіска на судне была праведзена толькі пасьля ўмяшаньня членаў камсоду, бо судком ня мог даць падобным выпадкам належнага адпору. Бернацкі-ж, атрымліваючы 148 руб. у месяц, не падпісаўся на пазыку; па яго прыкладзе пайшоў яго правая рука—пам. капітана Казлоўскі Лука.

У мэтах поўнага 100-процантнага ахопу работнікаў пазыкай абвешчаны пяцідзённік.

Воднік.

Не паслабляць работу ў горадзе

У асноўным кампанія рэалізацыі пазыкі сярод рабочых і служачых гораду закончана. Скончыўся таксама і тэрмін рэалізацыі пазыкі сярод неарганізаванага насельніцтва гораду.

Аднак, лічбы, якія мы маем сьведчаць аб тым, што вынікі кампаніі па некаторых раёнах далёка нездавальняючыя.

У той час, як кантрольная лічба па рабочых і служачых па БССР выкананна на 104,3 проц., па Барысаве заданьне выканана па рабочых і служачых усяго толькі на 82,1 проц., па Бабруйску—90,2 проц., па Рэчыцы—98,2 проц., па Чэрвені 96,6 проц., па Шклову—95,7 проц. і г. д..

Па неарганізаваным насельніцтве пры выкананьні кантрольнай лічбы па БССР на 59 проц., Аршанскі, Гарадоцкі, Барысаўскі, Быхаўскі, Бабруйскі і г. д. раёны не рэалізавалі ніводнага рубля.

Некаторыя раёны ўжо на сёньнешні дзень спынілі зусім работу па рэалізацыі пазыкі ў горадзе, ня гледзячы на тое, што мы маем у значнай колькасьці раёнаў пры даволі высокім фондзе заработнай платы зусім нізкі ахоп падпіскай рабочых і служачых. Амаль зусім не ахоплены адпускнікі, начныя зьмены, уноў паступаючыя на вытворчасьць і ва ўстановы рабочыя і служачыя. Зусім нізкі ахоп сэзонных і часовых рабочых, будаўнікоў, тарпяніка ў і г. д.

Прадпрыемствы, якія скончылі ў сябе падпіску, не прыйшлі на дапамогу адстаючым, у выніку маюць месца факты, калі падпіска не праведзена ў некаторых прадпрыемствах сярод рабочых цэлага цэху. Напрыклад, брыгадзір з Веткаўскага раёну паведамляе, што на канатнай фабрыцы, дзе працуе 800 чал. падпіска праходзіць дрэнна, з рабочых ткацкага цэху, у якім працуе 300 чал., на пазыку не падпісаўся яшчэ да гэтае пары ні адзін рабочы, і гэта здарылася таму, што парткалектыў і заўком палец аб палец не ўдарылі для таго, каб правесьці палітычна-масавую работу па пазыцы. Камсод зусім не працуе, прамадзкіх інструктароў ня вылучыў. Раённы камсод на кіруе работай камсоду на прадпрыемстве і ня цікавіцца ходам рэалізацыі пазыкі на прадпрыемстве.

Узмацняючы тэмпы рэалізацыі пазыкі на вёсцы, трэба не паслабляць, а ўзмацняць рэалізацыю пазыкі ў горадзе сярод адстаючых рабочых і служачых і асабліва сярод неарганізаванага насельніцтва.

Зараз надыходзіць тэрмін уплаты першага ўзносу па падпісцы на пазыку «3-га рашаючага году пяцігодкі» сярод рабочых і служачых, які павінен быць унесен з зарплаты за першую палову жніўня. Між тым, па цэлым шэрагу раёнаў яшчэ да гэтага часу не зьлікідаваны разьлікі па першым выпуску пазыкі «Пяцігодка ў чатыры гады».

Неабходна да 3-га тыражу, які адбудзецца 25 ліпеня зьліквідаваць усю запазычанасьць па падпісцы і раздаць падпішчыкам на рукі аблігацыі гэтае пазыкі. Задача фінансава-крэдытных устаноў і камсодаў выканаць гэтую работу ў тэрмін.

М. Рабцэвіч.

Брыгада рабочых электразаводу—шэфа НКФ СССР—у Менску

Учора 22 ліпеня ў Менск прыехала з Масквы брыгада рабочых у ліку трох чалавек, шэфствуючага над Наркамфінам Саюзу ССР Маскоўскага Электразаводу.

Брыгада ўдзельнічала ў нарадзе, скліканай НКФ БССР па пытаньнях рэалізацыі пазыкі на вёсцы.

Члены брыгады дапамогуць мясцовым і раённым арганізацыям у рабоце па рэалізацыі пазыкі на вёсцы, перадаўшы ім вопыт работы перадавых рабочых—электразаводцаў.

Л. П.

⊙ ГАЗЭТЫ ПАД СТАЛОМ. Лістаносец Ельскага паштовага аддзяленьня прыносячы выпісаныя рабочымі саўгасу «Добрык» газэты, замест таго, каб раздаць іх падпісчыкам, кідае газэты пад стол у канцэляры саўгасу. Пад сталом ужо накапілася шмат розных газэт і іх бярэ хто хоча, а падпісчыкі не атрымліваюць. Ельскае паштовае аддзяленьня ведае гэта, але ніякіх мер ня ўжывае.

Н.

УРАДЖАЙ ЛЕНУ

патрабуе добраякаснай праполкі і своячасовай падрыхтоўкі да ўборкі яго

Залежы лёнатрасты ломяць склады.—Цякучасьць рабочай сілы адбываецца па віне ад міністрацыі

(Лёзна)

На Лёзьненскім лёназаводзе ёсьць яшчэ неапрацаванай загатоўленай лёнатрасты каля 800 тон. Апроч гэтага ў гэтым-жа раёне ёсьць па калгасным сэктары каля 350 тон нязданай трасты веснавой высьцілкі.

Завод-жа пры поўным штаце рабочых зможа апрацаваць каля 250 тон у месяц. Пры такой норме апрацоўкі з вялікай напружанасьцю мажліва ўдалося-б апрацаваць лён да загатоўкі новага ўраджаю, але за апошні час на заводзе назіраецца вялікая цякучасьць рабочай сілы. Бываюць выпадкі, калі па дзьве вытворчых машыны стаяць па некалькі дзён з-за адсутнасьці рабочых. Прычыны вялікай цякучасьці рабочых у тым, што на заводзе нездавальняючае снабжэньне як з боку харчаваньня, так і па забесьпячэньні прамтаварамі.

Згодна пастаноў адпаведных органаў рабочыя заводу залічаны на забесьпячэньне па сьпісу № 2, але да гэтага часу атрымліваюць толькі хлеб (з перабоямі) і цукер, за 6 месяцаў рабочыя заводу атрымалі па 1 кгр. крупы, і 1 кгр. рыбы. Прамтавараў амаль ніякіх не атрымалі. Гэта пытаньне заводам ставілася ў адпаведных органах раёну; было запрапанавана райсаюзу наладзіць харчаваньне і забесьпячэньне прамтаварамі рабочых лёназаводу, але гэта пастанова засталася на паперы.

Такія адносіны да забесьпячэньня рабочых зрываюць выкананьне прамфінпляну, таксама магчымы зрыў загатоўкі і сыравіны лёнатрасты новага ўраджаю, бо з-за адсутнасьці рабочых апрацаваць маючуюся трасту лёназавод ня зможа, чым не дае магчымасьці аслабаніць месца для хаваньня новай.

В. Казлоў.

Лён не павінен мець апартуністаў

Беллёнасаюз ня ўмее курсаваць сваімі магчымасьцямі

Несвячасовая і нядбайная падрыхтоўка да ўборкі ўраджаю можа, калі ня поўнасьцю дык часткова, згубіць яго, можа зьвесьці на нішто вялізарную колькасьць затрачанага часу, можа выкінуць на вецер сродкі, якія былі затрачаны на падрыхтоўку глебы і г. д. Гэтага мабыць ня ведаюць работнікі Беллёнсаюзу і работнікі Боркавіцкага, Коханаўскага Дрысенскага і Асьвейскага раёнаў, а калі ведаюць дык займаюцца простым злачынствам. Разгледзім некалькі фактаў:

Беллёнсаюз ведае лёнам усяго індывідуальнага сэктару Беларусі. Але як праходзіць праполачная кампанія Беллёнсаюз ведае зусім туманна. Штодзённае інфармаваньне з раёнаў аб гэтай надзвычайна важнай галіне работы адсутнічае. Работнікі гэтай установы жывуць толькі тым, што робяць выезды, але як-бы яны не «праяжджаліся» (а іх ёсьць толькі тры чалавекі), дык за ўвесь час яны змогуць пабываць ня больш як у 20 раёнах, а 60 застаюцца па-за іх увагі. Вось які мэтад кіраваньня работаю ў раёнах з боку Беллёнсаюзу.

Інструкцыйныя матар'ялы па праполцы лёну, якія былі пасланы яшчэ ўвесну Беллёнсаюзам ніводнага разу не правяраліся. Людзі чакаюць інфармацыі аб праробленай рабоце на «авось», спадзяюцца на самацёк.

Беллёнсаюз ня ведае, колькі плошчы пад лёнам падлягае праполцы. Першая праполачная кампанія скамечана. Другую таксама сустрэў такі лёс.

Мясцовыя раённыя арганізацыі вельмі дрэнна папулярызуюць значэньне праполкі лёну. У раёнах Асьвейскім, Боркавіцкім, Коханаўскім, Дрысенскім зусім па-апартуністычнаму адносяцца як грамадзкія арганізацыі, так і партыйныя і нават сама аграномія. У гэтых раёнах усе аднагалосна, патураючы адзін аднаго, заяўляюць:—«Лён палоць? Навошта! Ці-ж работы няма! Калі ўдасца, дык і бяз поліва будзе лён».

Індывідуальны сэктар у пераважнай большасьці не зацікаўлены праполкаю лёну. Тлумачыцца гэта выключна тым, што з гэтым сэктарам не праводзіцца популярызацыйнай работы. А між тым на ўсебеларускай нарадзе старшынь райкаапсаюзаў, што адбылася 18-VI—1931 г. у Менску, была адведзена дастатковая ўвага праполцы лёну.

Раённыя і мясцовыя арганізацыі павінны зрабіць усё магчымае для таго, каб ня даць запанаваць над лёнам рознаму пустазельлю. На гэтую работу павінна быць мабілізавана ўся моладзь, піянэры, школьнікі і ўся вясковая моладзь.

Тодар Алесін.

Сьмілавіцкі раён ня думае аб праполцы лёну

Праполка лёну ў радзе месц Сьмілавіцкага раёну яшчэ і да гэтага часу не распачата. Рад калгасаў (імя 16 партызан, «Чырвоны Партызан», «Дзяржынскага», «Праца» і інш.). яшчэ за гэту справу ня думалі брацца.

Камсамольскія арганізацыі на праполку лёну глядзяць абыякава. Вакол гэтай кампаніі не мабілізавана грамадзкая думка. Такім чынам, кампанія праполкі лёну ня стала цэнтрам увагі партыйных і савецкіх арганізацый. Без адказнасьці ў рабоце неабходна заразжа палажыць канец і даць на руках тым, хто стараецца зьнізіць значэньне праполачнай кампаніі.

Лявіцкі Ц.

Інфармацыйныя паведамленьні

16—20 ліпеня адбыўся 3-ці кантрольны пленум ЦК ЛКСМБ, які разгледзіў наступныя пытаньні:

1. Аб выкананьні рашэньняў зьезду X ЛКСМБ і IX УсеЛКСМ аб ператварэньні камсамолу ў шматмільённую арганізацыю.

2. Аб выкананьні рашэньняў зьезду па ўдзелу ЛКСМБ у навкультбудаўніцтве.

3. Даклад Белторфаб'яднаньня і праверка выкананьня ўдзелу ЛКСМБ у вырашэньні тарфяной праблемы.

4. Вынікі веснавой сяўбы, аб уборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі.

Пленум выключыў з складу членаў ЦК ЛКСМБ Дурасава і вывеў т.т. Райхельсона і Гасьперскага.

У сувязі з адкліканьнем ЦК КП(б)Б т. Гайдукевіча на партработу, пленум аслабаніў яго ад абавязкаў старшыні ЦБ ЮП, члена бюро і сакратарыяту ЦК.

Пленум аслабаніў ад абавязкаў аргаддзелу і члена сакратарыяту ЦК тав. Пацукова, па яго асабістай просьбе, у сувязі з уходам на доўгае лячэньне.

Пленум аслабаніў т. Ільлічова ад абавязкаў члена бюро ЦК, а тав. Беранзона ад абавязкаў кандыдатаў у члены бюро ЦК у сувязі з уходам іх з камсамольскай на агульную работу.

Пленум зацьвердзіў загадчыкам оргаддзелу ЦК т. Казлова і ўвёў яго ў члены сакратарыяту ЦК

Пленум перавёў т. Рацэвіча з кандыдатаў у члены пленуму ЦК, абраў яго членам бюро і сакратарыяту ЦК і зацьвердзіў старшынёй ЦБ ЮП.

Пленум увёў у члены пленуму ЦК і абраў членам бюро ЦК т. Ждана (інструктар па камсамольскай рабоце БВО).

Пленум перавёў з кандыдатаў у члены бюро ЦК т. Гузікава і абраў кандыдатамі ў члены бюро ЦК т.т. Камісарчыка і Сапега, а з кандыдатаў ў члены пленуму пераведзены т.т. Аксянцова, Гейдэ, Кузьняцоў, Шаўцоў і Рутэнберг.

ЦК ЛКСМБ.

Загад Рэвалюцыйнага вайсковага савету ССС Рэспублік

№ 117. Масква 17-га ліпеня 1931 г.

1. Звольніць з радоў Рабоча-Сялянскай Чырвонай армії ў доўгатэрміновы водпуск радавы і малодшы начальствуючы склад тэрміновай службы:

а) з часьцей з 2-гадовым тэрмінам службы—прызыву 1929 году;

б) з часьцей з 3-гадовым тэрмінам—прызыву 1928 году;

в) з часьцей з 4-гадовым тэрмінам—прызыву 1927 году;

г) праходзячых службу ў парадку разьдз. X закону аб абавязковай вайсковай службе, вытрымаўшых іспыт на званьне начальствуючага складу запасу.

2. Звальненьне правесьці ў пэрыяд з 25-га верасьня па 15-га сьнежня г. г.

З унутраных войск АДПУ—да 15-га студзеня 1932 году і з пагранічнай варты—да 1-га красавіка 1932 году.

3. Пераменны радавы і малодшы начальствуючы склад тэрытарыяльных часьцей прызыву 1926 году зволіць у запас РСЧА.

Звальненьне правесьці па сканчэньні зборaў тэрытарыяльных часьцей.

4. Загад абвясьціць ва ўсіх ротах, эскадронах, батарэях, камандах, атрадах, дывізіёнах, суднах і экіпажах.

Падстава: Арт. 40 закону аб абавязковай вайсковай службе.

Намесьнік Народнага Камісара па Вайсковых і Марскіх Справах і Старшыні РВС СССР ГАМАРНІК.

Загад Рэвалюцыйнага вайсковага савету ССС Рэспублік

№ 118. Масква. 17 ліпеня 1931 г.

1. Прызваць на сапраўдную вайсковую службу ў Рабоча-Сялянскую Чырвоную армію ў пэрыяд з 1-га верасьня па 1-га лістапада г. г. грамадзян нараджэньня 1909 году і старэйшых узростаў, якім скончыліся адтэрмінаваньні ні прызыву.

Дакладныя тэрміны прызыву ўстанавіць Рэвалюцыйным Вайсковым Саветам акруг.

2. Прызываемых, якія раней праслужылі ў страявых часьцях РСЧА ня менш аднаго году або ў адміністрацыйных установах РСЧА ня менш 2-х год, лічыць адбыўшымі тэрмін службы і пералічыць у катэгорыю доўгатэрміновадпускных.

Грамадзян нараджэньня 1901 г. ад прызыву аслабаніць і пералічыць у запас першай чаргі.

Падстава. Арт 131 закону аб абавязковай вайсковай службе.

Намесьнік Народнага Камісара па Вайсковых і Марскіх Справах і Старшыні РВС СССР ГАМАРНІК.

Даць Чырвонай армії

клясава-вытрыманае папаўненьне

Чырвоная армія заклікана забясьпечыць і адстаяць ад усіх нападаў ворагаў пралетарскай рэвалюцыі незалежнасьць СССР, абараніць сацыялістычнае будаўніцтва і мірную працу рабочай клясы і калгасных мас.

Чырвоная армія моцна клясавай сьвядомасьцю яе байцоў і камандзіраў, самаахвярнай адданасьцю справе сацыялізму.

Баец Чырвонай армії павінен быць гатовы да сьмелых і рашучых дзеяньняў, накіраваных на зьнішчэньне ўзброеных сіл ворагаў. Нязпынная баявая гатоўнасьць, дысцыплінаванасьць і ўменьне скарыстаць поўнасьцю сваю зброю супроць ворагаў Савецкага саюзу—вось якімі якасьцямі павінен валодаць баец Чырвонай армії. Такіх байцоў чакае Чырвоная армія ў свае рады ад прызыўнікоў 1909 году.

Гэтымі баявымі якасьцямі ўладае толькі баец, які вышаў з асяродзьдзя рабочае клясы і працоўных мас.

Сыны кулакоў, папоў, шкоднікаў ня могуць уладаць такімі якасьцямі, ім нельга даверыць зброю ў рукі. Трэба пазбавіць пралязаньне ў рады Чырвонай армії гэтага клясава-чужога элемэнту.

Пры сельскіх і раённых выканаўчых камітэтах створаны спэцыяльныя камісіі па выяўленьні клясава-чужых элемэнтаў. Гэтыя камісіі павінны абапірацца ў сваёй рабоце на рабочыя і калгасныя масы. У іх павінны прымаць актыўны ўдзел камсамольскія ячэйкі, райкомы камсамолу. Паседжаньні камісій павінны быць адкрыты ў прысутнасьці рабочых, калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас.

Клясавы вораг ужывае рознага роду хітрыкі каб пралезьці ў рады Чырвонай армії. Адным з спосабаў зьяўляецца яўка на прызыў у такім горадзе ці сяле, дзе менш за ўсё яго ведаюць ці зусім ня ведаюць. Утаіўшы свой клясавы твар,—ён пралазіць у Чырвоную армію. Трэба ведаць гэты спосаб і выяўляць вялікую клясавую пільнасьць праверкі ўсіх даных асобы, якая зьявілася на прызыў не па месцы сваёй прыпіскі.

Задача—даць Чырвонай армії клясава сьвядомых, дысцыплінаваных, самаахвярна адданых байцоў справе пралетарыяту—вялікая і адказная. Яна можа быць выканана пры ўдзеле рабочых і калгасных мас пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі.

Між тым у радзе раёнаў гэта работа разгорнута вельмі і вельмі кепска.

Вось як працуе Магілеўская камісія пры РВК. Зьвестак ад селькораў аб ходзе выяўленьня клясава-чужых элемэнтаў не паступала. Старшыня РВК парашыў выклікаць старшынь сельсветаў са сьпісамі прызыўнікоў. Старшыні сельсавету прыбылі з імі, у адну ноч справаздач РВК выяснілі усіх клясава-чужых. У выніку ў лік клясава-чужых трапілі зусім ня чужыя. Аб клясавай прыналежнасьці судзілі па характарыстыцы старшыні сельсавету і фармальных даных аб уплаце с.-г. падатку. Таму, што старшыня сельсавету ведаць усіх прызыўнікоў ня мог, дык яго характарыстыка была беспадстаўная, толькі для таго, каб адбыць абавязак.

Такая работа за клясава адданых прызыўнікоў нікуды нягодная.

Ня лепш справа стаіць у Полацкім раёне. Наогул многія камісіі працуюць бяз удзелу рабочых і калгасных мас, бяз удзелу камсамольскіх і прафэсыянальных арганізацый.

У інтарэсах баявой магутнасьці Чырвонай армії трэба перабудаваць работу сельскіх і раённых камісій. Трэба рашуча перасекчы бюракратычны мэтад работы камісій: толькі-б адпісацца.

За клясава-адданага прызыўніка, будучага байца Чырвонай армії!

Егорычаў.

Ачысьціць лясныя апараты ад чужакоў

Разгарнуць шырокую падрыхтоўку да асеньняга сплаву

У Машчаніцкім сельсавеце лесазагатоўкі і лесавывазкі праходзяць самацёкам.

Улічваючы мінулыя недахопы, рыхтуйцеся да асеньняга сплаву

Што паказаў нам веснавы лесасплаў

Увосень, як заўсёды, менш будзе сплаўной драўніны, а сплаўляць яе будзе вельмі цяжка, таму што ўвосень дні маленькія і надвор'е бывае мокрае, ветранае, што, бязумоўна, будзе перашкаджаць сплаву лесу. Таму сплаўныя арганізацыі не павінны марудзіць ні воднага дня: каб падвезены лес ня гніў ў вадзе, а зараз-жа сплаўляўся. На глыбокую восень павінна застацца тое, што падвязуць у верасьні месяцы.

Падвезенага-ж у верасьні месяцы лесу многа быць ня можа і з ім можна ўпаўне справіцца.

Улічэце мінулыя недахопы

Увесну былі прарывы на лесасплаве ў наступных мясцох: а) на рацэ Гайна: ад ніправаільнай расстаноўкі сіл Бярэзінскай канторай і няўважлівых адносін мясцовых арганізацый; б) на рацэ Прыпяці: ад незагатоўкі гужбы і арганізацыйных непаладак. Праўда, на Прыпяці гэтыя прарывы былі своячасова ліквідаваны.

Можна налічыць шмат дробных фактаў на ручастках лесасплаву. Работнікам неабходна ўсе недахопы запісваць з такім разьлікам, каб улічваць гэтыя недахопы надалей: як на восень, так і на будучы год. Бяз гэтага ўлічваць усе недахопы будзе вельмі цяжка. Многія таварышы ня хочуць гэтага рабіць; яны адмаўляюцца тым, што няма для гэтага часу. Чаму-ж гэтага часу няма? А няма яго таму, што многія ня ўмеюць

У бой за торф

Даць топкам торф

„ЦК КП(б)Б і СНК БССР прапануюць... зараз-жа стварыць... пералом у здабычы торфу, мабілізаваўшы ўсе сілы партыйных, савецкіх і прафесіянальных арганізацый на барацьбу за торф...“

(З пост. ЦК КП(б)Б і СНК БССР)

Тварцы бальшавіцкіх перамог

Ад Менску да Цьнянскага балота—15 кілёмётраў. Гэта тыя 15 кілёмётраў; пасьля якіх перад табой адкрываецца, з палосамі срабрыстай вады, з вялізарнымі пакладамі нарэзанага торфу, вялікая чорна-зялёная раўніна; гэта тыя 15 кілёмётраў, за якімі знаходзіцца база энэргетыкі для менскіх заводаў—страва для Менскай электрастанцыі.

За ўвесь сэзон 1931 году на Цьнянскім балоце павінна быць здабыта 15.264.000 цаглін торфу. На першую-ж дэкаду ліпеня сэзоннае заданьне выканана на 57,86 проц. па машынафармовачным торфе і 40,20 проц.—на рэзным торфе. Тлумачыцца гэта тым, што спачатку сэзону адчуваўся недахоп дастаткова кваліфікаваных параўшчыкоў (машыністаў, кваліфікаваных рабочых). Спачатку давала сябе адчуваць і непрыстасаванасьць да работы і саміх рабочых. Вось чаму спачатку тыя машыны, якія павінны былі даваць у дзень па 34 і 26 тысяч цаглін, ня выконвалі ўскладзеныя на іх нормы. Далёка ня выконвалі нормы і ручнікі.—быў прарыў.

Над балотам сумна кігікалі кнігаўкі. Яны раз-по-раз падымаліся над раўнінаю і кідалі адтуль такія гукі, якія былі падобны да голасу маткі, што шукае загубленае дзіцё.

Назоўліва зьвінелі камары, сьляпіцаю вяжучыся да жывога чалавека, каб знайсьці дзе лапінку цела, высмактаць пажывы. І тыя рабочыя, якіх часамі грыз прывязьлівы камар, нават не адчувалі болі, бо, здаецца, камар не прасаджваў доўгае дзюбы праз той тоўсты пласт трывогі, якая вісела на кожным рабочым, на кожным параўшчыку.

Адміністрацыя схамянулася:.

— Хутчэй ліквідаваць непрыстасаваных рабочых, ліквідаваць недакваліфікаванасьць параўшчыкоў.—У гэтым парука посьпехаў выкананьня прамфінпляну.

Сярод рабочых была праведзена растлумачальная работа. Рабочым далі добра зразумець, што торф у Беларусі зьяўляецца асноўнаю базаю для пераўтварэньня краіны ў індустрыяльна-аграрную. Разам з гэтым былі перагледжаны брыгады. І брыгада Вяльмякіна, якая заўсёды адставала толькі таму, што брыгадзір Вяльмякін захлынаўся ў гарэлцы,—зьмяніла гэтага «брыгадзіра». У выніку, з сямі брыгад 6 брыгад абвяшчаюць сябе ўдарнымі... Толькі адна брыгада Гарбушына на сёньнешні дзень выконвае і перавыконвае свае заданьні але яна не абвяшчае сябе ўдарнай.

Балота застагнала пад цьвёрдымі ўдарамі ўдарных брыгад. Па-новаму загулі вялізарныя паравыя машыны—лёкамабілі. Па іншаму зашорхалі гострыя разцы. Ня было чуваць над бажотам сумнага кігіканьня кнігавак. Над раўнінай стаяла здаровае праразьстае паветра. Твары рабочых паранейшаму былі абмазаны чарназёмам, але самі рабочыя былі рухавыя, на іх тварах гусьцілася радасьць. Усё гэта зьвязана было з тым, што зараз норма выпрацоўкі выконвалася і перавыконвалася.

На першай і трэцяй машыне норма выпрацоўкі на чалавекадзень — 1.134 цагліны, а на другой і чацьвертай машынах—812 цаглін. Ёсьць-жа выпадкі, калі некаторыя брыгады выконваюць гэтую норму на 190 проц. Такімі брыгадамі зьяўляюцца брыгады наступных таварышоў: Сударава, Гурына, Ерачкіна. Для ілюстрацыі таго, як зараз узьнялася продукцыйнасьць у працы брыгад, лепш за ўсё скажа сама ведка дзённага выкананьня пляну за 19-VII г. г. Брыгада тав. Гурлінава заданьне выканала на 124,75 проц., брыгада тав. Ерачкіна—129,87 проц., тав. Капітонава—на 115,43 проц., тав. Гарбушына—на 106,65 проц. Гэтыя брыгады за апошні час заўсёды перавыконваюць свае заданьні.

У выніку такой упартай працы сэзоннае заданьне за другую дэкаду ліпеня, гэта значыць на 20-га ліпеня, праз 10 дзён пасьля першай дэкады,—выканана па машынафармовачным торфе на 70,5 проц. і па разным—на 47,2 проц.

Вось тыя лічбы, якія характарызуюць барацьбу рабочых Цьнянскіх торфараспрацовак за выкананьне прамфінпляну.

Зараз перад рабочымі і перад торфазаводзкімі арганізацыямі стаіць пытаньне ва ўсю шырыню, каб закончыць цалкам сэзонны плян.

— І плян гэты,—гаворыць старшыня торфкому, вылучэнец заводу імя Варашылава, тав. Халадзінскі,—будзе выкананы абавязкова. Для гэтага ўжо прыняты такія захады: усе ўдарныя брыгады ўступілі ў конкурс за пераходны ўнутрызаводзкі сьцяг. Зьвернута належная ўвага на палепшаньне харчаваньня—гэтага асноўнага цэху ў выкананьні пляну. Вызначаны грашовыя прэміі тым брыгадам, якія лепш выконваюць свой прамфінплян. Заканчваецца правядзеньне работы па растлумачэньні аб новым законе, згодна якога даецца рад ільгот сэзоньнікам-адходнікам (адходнікі—гэта калгасьнікі, ці аднаасобнікі, якія прыйшлі непасрэдна з гаспадаркі на торфараспрацоўкі). Прапрацоўваецца прамова тав. Сталіна, якую рабочыя адзначаюць новым бурным уздымам у працы, новым уздымам за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

5-га жніўня заканчваецца сэзон на Цьнянскіх балотах. Тыя чатыры пяцідзённікі, якія засталіся да канца сэзону, патрэбна пераўтварыць у штурмавыя дэкады па здабычы торфу.

Тодар Алесін.

22-VII—1931 г.

За семдзесят тысяч!

«Правду» павінны чытаць усе перадавыя рабочыя, калгасьнікі і саўгасьнікі, беднякі і сераднякі, каб яны своечасова знаёміліся з важнейшымі мерапрыемствамі партыі і ўраду.

Абвешчаная два месяцы назад кампанія за 2-мільённы тыраж «Правды», энтузіязм рабочае клясы Савецкага Саюзу і гэта кампанія ператварылася ў вялізарную масавую палітычную кампанію барацьбы за ўкараненьне цэнтральнага органу партыі ў шырокія масы працоўных.

Цэлы рад вобласьцей, аградоў: Харкаў, Растоў, Новасібірск, Ташкент і іншыя) дамагліся вялікіх вынікаў па павялічэньні тыражу «Правды», павялічыўшы тыраж «Правды» на 50 проц.

Побач з гэтым у паасобных гарадох, у прыватнасьці па Беларусі, замест разгорнутай масавай работы па прасоўваньні «Правды» па прычыне бязьдзейнічаньня паштовага апарату, тыраж «Правды» рэзка зьнізіўся. Досыць зазначыць, што тыраж «Правды» па БССР зьнізіўся з 55 тысяч у чэрвені да 49 тысяч у ліпені. Такія буйнейшыя гарады, як Бабруйск, Віцебск, Гомель і Магілеў да гэтага часу не палічылі патрэбным паведаміць, як праходзіць пятнаццацідзёньнік.

Там, дзе партыйныя арганізацыі пабальшавіцку ўзяліся за ажыцьцяўленьне дырэктывы ЦК КП(б)Б, мае месца значны зрух у бок павялічэньня тыражу «Правды». Сустрэчныя пляны заводаў «Энэргія», «Бальшавік», «Камунар» і інш. сьведчыць аб шырачэзным уздыме шырокіх мас рабочых за ўкараненьне цэнтральнага органу ў масы, разам з тым маюцца такія арганізацыі, якія лічаць, што дырэктыва ЦК іх не датычыцца. Чаго варта заява апартуністаў з Наркамюсту—«у нас усе ў водпуску, людзі падпісаліся на розныя газэты, «Правдой» займацца ня будзем».

Газэтна-паштовы апарат Беларускага кіраўніцтва сувязі не перабудаваўся і не жадае перабудоўвацца, адсутнічае ўсякая апэрацыйнасьць. Кіраўніцтва рэённымі аддзяленьнямі сувязі пастаўлена не на належную вышыню.

Сэктар друку кіраўніцтва сувязі, як гэта высьветлілася на нарадзе пры культпропе ЦК КП(б)Б, і зараз абяцае шмат чаго, але ня робіць нічога. Да гэтага часу кіраўнікі сэктару друку ніяк ня могуць расстацца з пунктам гледжаньня «камэрцыйным».—Давайце дадатковыя пропанты і іншае,—гаворыць яны.

Значны ўплыў на зьніжэньне тыражу «Правды» мае надзвычайна дрэнная дастаўка газэт падпісчыкам. Досыць зазначыць, што ў Менску, у рэспубліканскім горадзе падпісчыкі «Правды» атрымліваюць газэты надзвычайна нерэгулярна. Кіраўніцтва сувязі прымае некаторыя захады па палепшаньні дастаўкі, але яны настолькі нязначныя, што процант скаргаў не зьмяншаецца.

Зусім нездавальняюча распаўсюджваецца «Правда» сярод шырокіх мас калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў. Публікуемая сёньня адозва калгасьнікаў калгасу «Луч Камуны» гаворыць аб тым, што калгасная маса з вялікім энтузіязмам сустрэла пачаўшуюся кампанію па прасоўваньні «Правды» ў шырокія масы рабочых і калгасьнікаў. Задача партыйных арганізацый неадкладна шырока скарыстаць адозву калгасьнікаў «Луч Камуны», шырока разгарнуўшы сацыялістычнае спаборніцтва наміж калгасамі за максымальны ахоп перадавых калгасьнікаў цэнтральным органам «Правдой».

Дырэктыва ЦК дабіцца да 1-га жніўня па рэспубліцы ня менш 70 тысяч падпісчыкаў на «Правду»—заданьне зусім рэальнае і магчымае для выкананьня.

Да канца пятнаццацідзёньніку засталіся лічаныя дні. Трэба неадкладна разгарнуць масава - растлумачальную работу па ўцягненьні новых тысяч чытачоў «Правды». Дырэктыва ЦК КП(б)Б павінна быць выканана цалкам і ў тэрмін.

Да ўсіх калгасьнікаў БССР

Савецкая Беларусь пад выпрабаваньнем кіраўніцтвам КП(б)Б і яе ленінскага ЦК пры брацкай дапамозе ўсяго Савецкага Саюзу з б. калёні царскай Расіі, краіны адсталасьці і жабрацтва, хуткімі тэмпамі ператвараецца ў саўгасна-калгасную індустрыяльную краіну, у рэспубліку сацыялістычных фабрык зерня, мяса і тэхнічных культур.

Ламаючы старыя ўстоі, ствараючы сацыялістычную гаспадарку—калгасы і саўгасы, ліквідуючы кулацтва, як клясу, на аснове суцэльнай калектывізацыі, мы дасягаем новых перамог на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Наш калгас «Луч Камуны», Старобінскага раёну, які аб'ядноае 172 бяднацка-серадняцкіх гаспадаркі, адзін з тых, які пад кіраўніцтвам КП(б)Б дамогся вялікіх перамог на фронце другой бальшавіцкай сяўбы.

Плян сяўбы намі перавыканан. Пабальшавіцку падрыхтаваліся да ўборачнай кампаніі. Дзякуючы шырокаразгорнутаму сацыялістычнаму спаборніцтву і ўдарніцтву, правільнай арганізацыі працы мы датэрмінова скончылі вяроўку і сенаўборку.

Гэтым перамогам роўна як і ва ўсіх посьпехах Савецкага Саюзу мы ў многім абавязаны цэнтральнаму органу нашай партыі «Правде». Чытаючы бальшавіцкую «Правду», мы атрымлівае нязьлічоную колькасьць указаньняў, якія мы ўжываем ў штодзённай нашай рабоце (па правільнай арганізацыі зьдзельшчыны, расстаноўцы сіл, арганізацыі вучоты і інш.).

Праз «Правду» мы знаёмімся з гераічнай барацьбой рабочае клясы і бяднацка-серадняцкіх мас вёскі за выкананьне пяцігодкі ў 4 гады. Між тым Ц. О. «Правда» яшчэ мала распаўсюджана сярод шырокіх мас вёскі.

Вось чаму мы шчыра вітаем пачатую кампанію за прасоўваньне «Правды» ў шырокія масы рабочых і калгасьнікаў.

З свайго боку мы ўсе як адзін пісьменныя калгасьнікі падпісваемся на «Правду» ў колькасьці 150 экз. і абвяшчаем сябе ўдарнікамі «Правды» па прасоўваньні цэнтральнага органу партыі ў калгасныя масы; бярэм шэфства над кальцавой поштай і абяцаем ён аказаць рэальную дапамогу ў справе прасоўваньня «Правды» ў вёску і наглядаць за своечасовай дастаўкай яе падпісчыкам.

Мы зьвяртаемся да ўсіх калгасьнікаў БССР узяць з нас прыклад.

Таварышы калгасьнікі, выступайце з канкрэтнымі абавязацельствамі, уключайцеся ў паход за новыя мільёны чытачоў цэнтральнага органу «Правды», окажэце канкрэтную дапамогу паштовому і газэтнаму апарату па прасоўваньні «Правды» ў вёску!

Па прыкладзе рабочых буйнейшых заводаў і фабрык на аснове сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва шырока разгорнем масавую растлумачальную работу па прасоўваньні «Правды» ў масы.

Прас Ц. О. «Правду» і Ц. О. Зьвязду» абяцаем, што на аснове разгорнутага сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, на аснове зьдзельшчыны, правільнай арганізацыі працы, кіруючыся пастановамі пленуму ЦК УсеКП і ЦК КП(б)Б і апошнем указаньнем тав. Сталіна, пад кіраўніцтвам КП(б)Б па-бальшавіцку выканаем плян уборкі і з посьпехам завяршым асенняю сяўбу.

Няхай жыве Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) і яго орган—бальшавіцкая «Правда».

Атрымны сход калгасьнікаў «Луч Камуны», Старобінскага раёну.

Вопыт перадавых прадпрыемстваў Менску

перанесьці на ўсе заводы і фабрыкі БССР

Партарганізацыі буйнейшых прадпрыемстваў г. Менску па-баявому ўзяліся за рэалізацыю пастановы ЦК і Менскага гаркому КП(б)Б па прасоўваньні «Правды» ў масы. Парткалектыў заводу імя Варашылава высунуў сустрэчны плян па «Правде», які павялічвае кантрольнае заданьне на 50 проц. Таксама высунулі свае сустрэчныя пляны заводы «Камунар», «Бальшавік», абутковая і іншыя. На ўсіх партыйных ячэйках, цэхавых і зьменных абгаварвалася пытаньне прасоўваньня «Правды», вылучаны ячэйкавыя ўпаўнаважаныя, шырока разгарнулася падпіска.

Разам з тым, рад прадпрыемстваў і установ да дырэктывы ЦК і гаркому адносіцца фармальна. У Наркамюсьце кіраўнікі партыйнай ячэйкі не жадаюць водаў і ўстаноў.

Прамысловыя гарады ня сьмеюць адставаць.—яны павінны быць наперадзе па прасоўваньні «Правды» ў масы.

Шклоўчына ідзе наперадзе

ШКЛОЎ. 21-га ліпеня. Райком КП(б)Б і газэтнае бюро па-ўдарнаму ўзяліся за выкананьне дырэктывы ЦК аб прасоўваньні «Правды» ў масы. За першыя 4 дні пятнаццацідзёньніка завербавана 315 падпісчыкаў на «Правду».

За 3 дні—150 падпісчыкаў

ЧАРЭЯ, 21-га ліпеня. Партыйная арганізацыя праводзіць масавую растлумачальную работу па прасоўваньні «Правды» ў масы. Увесь нізавы друк рэгулярна асьвятляе ход пятнаццацідзёньніка. За тры дні штурму завербавана 150 новых новых падпісчыкаў на «Правду» Газэтна бюро выслухала сустрэчны плян распаўсюджваньня «Правды» па раёне, які павялічвае кантрольныя лічбы на 50 проц.

Вылучана 11 брыгад па вярбоўцы падпісчыкаў на „Правду“

ВОРША. 21-га ліпеня. Райком КП(б)Б у адпаведнасьці з рашэньнем ЦК КП(б)Б прыняў спэцыяльнае рашэньне, якое абавязвае ўсе нізавыя арганізацыі неадкладна разгарнуць работу па прасоўваньні «Правды» ў масы. На ўсіх партыйчэйках абгаварвалася пытаньне аб тыражы «Правды». Па гэрадзе вылучана 11 брыгад, якія правяраюць ход работы па выкачэньні дырэктывы ЦК і гаркому партыі аб прасоўваньні «Правды» ў масы.

Буйнейшыя прамысловыя гарады: Віцебск, Гомель, Бабруйск, Магілеў, дзе асабліва мае месца зьніжэньне тыражу «Правды», замест паказу ўзорнай барацьбы за выкананьне дырэктывы ЦК КП(б)Б, цягнуцца ў хвасьце.

Ня гледзячы на катэгарычныя дырэктывы, газэтныя бюро гэтых гарадоў да гэтага часу не далі ніякіх вестак аб ходзе штурму па ліквідацыі прарыву па прасоўваньні «Правды» ў масы. Начальнікам Беларускай акругі сувязі пастаўлена на від кіраўнікам газэтнага бюро, але гэта недастаткова. Раённыя камітэты партыі гэтых раёнаў павінны неадкладна праверыць работу сваіх газэтных бюро.

За сваячасовае выкананьне дырэктывы ЦК аб прасоўваньні „Правды“ ў масы

Пяць год, як няма Дзяржынскага.

Але жыве яго справа, жывуць яго думкі, жыве яго тактыка, і з ім прыходзіцца лічыцца як з жывым будаўніком сацыялізму, работнікам сучаснасьці, а не гераічнай фігурай мінулага, адыходзячай з кожным днём у забытасьць. Дзяржынскі быў практык, не тэарэтык, а ўплыў практыкаў, зьмяшоўшых са сцэны, хутчэй угасае, але ён, сумленны, адданы і сьціплы ў сваёй гераічнай велічы партыйны дзеяч, умеў быць дыялектыкам у сваёй рабоце, навучыўся дыялектыцы ў рэвалюцыйнай барацьбе, на катарзе і высылцы, у партыйным супрацоўніцтве з Леніным і Сталіным—і ён жыве, ён дагэтуль апладатвае справу барацьбы за камунізм.

Дзяржынскі літаральна да канца быў верны партыйным заветам, аддаў свае жыцьцё за іх, для рабочай клясы, для партыі, проста, ня выпукляючы сваёй

фігуры. А тыя, з якімі пад кіраўніцтвам Сталіна ён змагаўся, апазіцыянэры,—калі яны ўпарствуюць,—яны знаходзяцца па той бок барыкады, лаюць пяцігодку на старонках буржуазных газэт, капаюць маленькую ямку пад будуючымся сацыялізмам побач з Гувэрам і іншымі імпэрыялістамі.

Прыклад: жыры мярцьвяк у Канстантынопалі, літаратар-рэнэгат.

Словы Сталіна аб старой тэхнічнай інтэлігенцыі і аб нашым падыходзе да яе—ці-ж не гавораць яны аб жывучасьці тактыкі Дзяржынскага, ня выдуманай ім, а цалкам выцякаўшай з партыйных вытокаў?

Я ня сумняваюся, што Дзяржынскі з усёй палкасьцю сваёй істоты вітаў-бы прамову Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў, яна была-б для яго роднай і таварышы гаспадарнікі магчы-б гэта давесьці, але я хачу расказаць толькі аб тым, як у іншых абставінах у абставінах нэпу, Дзяржынскі праводзіў адпаведную лінію ў адносінах да старых спэцыялістаў і ў НКШляхоў і ў ВСНГ і як ён прымушаў АДПУ дапамагаць яму ў яе правядзеньні.

ВСНГ, калі Дзяржынскі пачаў у ім сваю работу, зьяўляўся свайго роду новым каўчэгам, асеўшым на Мілюцінскім завулку: многа старых гаспадарнікаў, вопыт якіх вельмі часта вымяраўся колькасьцю разваленых прадпрыемстваў, часта не хацеўшых вучыцца і ня ведаўшых вытворчасьці. З другога боку—безьліч спэцаў, займаўшыхся тады шкадлівым і клапатлівым нічаганяроблениым, схэмамі, праэктамі, перапіскай, у тым ліку і са сваімі былымі гаспадарамі, якім нават іншыя буйнейшыя імёны рускай тэхнікі ня гнушаліся паведамляць за мзду весткі аб стане іх былых прадпрыемстваў.

Фэлікс Эдмундавіч прышоў туды з цяжкім сэрцам. Яшчэ ў НК Шляхоў яму было вядома, што многія будучыя правыя апазіцыянэры лічуць яго ўдар нікам, а не гаспадарнікам, чакісцкімі мэтадамі падняўшым транспарт ад разрухі. Тыя-ж асобы не бяз зларадцтва чакалі, ці не праваліцца ён, ці вытрымае экзамен на гаспадарніка, кіруючы гэткай махінай як ВСНГ.

Час быў нэпаўскі і цяжкі: яго прыходу папераджаў цяжкі крызіс цэн.

На дапамогу гэтых «прыцеляў» Дзяржынскі не разьлічваў, але ў яго былі энкапэсэфскі вопыт і чакісцкія мэтады, асноваю якіх зводзілася да таго, каб ні на кога не спадзявацца, а ўсё правяраць на фактах, даходзіць да іх самому, працаваць з максімальнымі тэмпамі, разьвіваючы шалёную энэргію, абапірацца на рабочую клясу і безагаворачна слухацца партыі. Быў у яго вопыт і са спэцамі, старымі, таму што ў 1921-24 гадох маладых спэцыялістаў ня было. Прыйшоўшы ў НКШляхаў, Дзяржынскі адразу ўзяў тую лінію на прыцягненьне спэцыялістаў да работы, прадстаўленьне яму максымальнай самастойнасьці і патрабаваньне ад яго сапраўднай работы, а не пражэктарства, якую ён вёў да самай сьмерці. Дырэктыўны загад па НКШляхаў на 27 мая 1921 г. гаворыць: «да тых з тэхнічных кіраўнікоў, якія натхнёны вялізарнасьцю стаячых перад імі задач па тэхнічным адраджэньні транспарту рабоча-сялянскай рэспублікі і работаюць самаадданна і сумленна, мы абавязаны адносіцца з поўным давер'ем і таварыскай увагай». Гэта Дзяржынскі праводзіў.

Дзяржынскі шырака скарыстаў АДПУ для абароны спэцыялістаў ад розьнага роду ўцюку, жыльлёвага і іншых, але ён вельмі хваравіта адносіўся да фактаў апошняга роду, яны зьмывалі яго лінію, ён лічыў, што калі сацыялістычнае будаўніцтва сваёй магутнасьцю прыцягвае да нас нават былых актыўных контр-рэвалюцыянэраў, іх трэба скарыстаць абавязкова—ва ўсю, і да тых пор, пакуль яны ідуць з намі. Трымаць адкрытымі вочы трэба, але нельга дапускаць, каб людзі, працуючыя з намі, пад уплывам прасьледваньня абкружаючага асяродзьдзя і яго вечнай западозранасьці і недавер'я, часта няпісьменнага, зноў уходзілі ў лягер ворагаў.

У НКШляхаў Дзяржынскаму ўдалося вывесьці транспарт з разрухі аб'ядніўшы вакол сябе ў адным гераічным парыве і чыгуначны пралетарыят, і камуністаў, і спэцыялістаў, а калі ўласных сіл транспарту не хапала, ён налягаў на транспартны аддзел АДПУ, дзе было многа чыгуначнікаў, і ў шмат кіх выпадках падмяняў іх сіламі прышоўшую ў расстройства рэгулярную работу транспарту. Транспартнікі АДПУ работалі дзень і ноч, то прасоўваючы грузы, то ахоўваючы іх, то змагаючыся з бандытызмам, кражамі, машэнствам і інш. і інш.—гадамі ня маючы адпачынку, як на фронце.

І ўсё-ж, ня гледзячы на ўсе посьпехі, у прыватнасьці ў прыцягненьні спэцыялістаў на работу, Дзяржынскі апошнія месяцы перад уходам з НКШляхаў паўтараў: «няма больш контр-рэвалюцыйных спэцаў, чымся мае». У чым справа? Ён не спыняўся на дасягнутых посьпехах: вывучыўшы транспарт, лічыў далейшы прагрэс тэхнічна магчымым; між тым уздым транспарту, на яго думку ішоў вельмі марудна, а калі ён хацеў разабрацца у чым загвазда, дык пасьля 2 год работы ён заазначай атрымліваў ад спэцыялістаў фільюны граматы, апранутыя ў карэктную інжынэрную пуцейскую форму.

У апошні год яго работы на транспарце здарыўся такі красачны выпадак: яму патрабавалася адна важная табліца: апрымаўшы яе, Дзяржынскі са зьдзіўленьнем убачыў, што малюнак атрымліваецца надзвычайна смутны і няясны. Пайшоўшы ў водпуск на 10 дзён, Дзяржынскі засеў за яе, і ён, наркомшляхаў, павінен быў сам пералічыць і перарабіць яе і тады з абурэньнем пераканаўся, што ня толькі даныя перапытаны, але нават складаньне няверная. Для добрадушнага агульнага давер'я да апарату месца ня было.

З гэтым вопытам Дзяржынскі прыступіў да ВСНГ, і ўсё-ж такі лінію сваёй да спэцыялістаў ён не зьмяніў. Гэта ў першую чаргу адчувала АДПУ. Калі мы атакоўвалі яго па повазу якіх-небудзь меншавікоў, ён нязьменна паўтараў нам: «зараз яны бяссільны, да пары да часу пакінце іх у спакоі, няхай яны работаюць, я суджу аб іх па рабоце». Ня буду падаваць далейшых прыкладаў, як ён палітычна выхоўваў работнікаў АДПУ, ня буду паўтараць усім вядомых публічных выступленьняў Дзяржынскага аб старых спэцыялістах, ня мне апавядаць, як ён чысьціў, рэарганізоўваў ВСНГ,—аб апошнім няхай расказуць гаспадарнікі.

Раскажу ў заключэньне, як ён скары стоўваў АДПУ для ВСНГ. Пытаньне так і было пастаўлена, што можна будзе ўзяць у нас для ўздыму прамысловасьці, па-першае, людзей, людзей і людзей. Будучы наркамшляхоў, Дзяржынскі абапіраўся на транспартны аддзел АДПУ, прамысловай ЧК ня было, а стараць яе ён лічыў бескарысным. Сярод транспартнікаў было многа чыгуначнікаў, але прамысловай тэхнікі мы тады ня ведалі. Вопыт ВЧК па барацьбе са спэкуляцыяй і справы па безгаспадарчасьці складалі дрэнную падрыхтоўку для такой прамысловай ЧК, якая магла-бы быць карысна Дзяржынскаму, але буйных талковых людзей з інтарэсам да эканомікі, жадаючых вучыцца вытворчасьці было многа. Дзяржынскі іх-та і зрабіў правадніками сваёй лініі ў адносінах да спэцыялістаў, забраўшы іх усіх у ВСНГ.

Як мы тады гаварылі, ВСНГ ператварыўся ў грабілаўку, забірае нашых людзей. Мы разумелі неабходнасьць гэтай меры, і выніку работы Дзяржынскага ў ВСНГ зусім яе апраўдалі. Але нарэшце, і мы ня страцілі. Калі зьмяніліся абставіны і запахла інтэрвэнцыяй і цэлы рад інжынэраў заняўся шкодніцтвам, дык выкрылі яго на капальнях і ў НКПС два таварышы, узятыя Дзяржынскім на работу ў ВСНГ і вярнуўшыяся да нас. Карыстаючыся сваім вопытам, яны змаглі паставіць калумбава яйка, што зьяўляецца асноўным у барацьбе з новымі формамі контр-рэвалюцыі.

Школа Дзяржынскага не прапала дарма.

В. Менжынскі

Прамова тав. Сталіна павінна стаць праграмай дзейнічаньня

Завод „Чырвоны Мэталіст“ на парозе рэканструкцыі

Прапанова заводу «Чырвоны Мэталіст», зьмешчаная ва ўчарашным нумары нашай газэты, вельмі яскрава нацьвярджае правільнасьць аналізу тав. Сталіна аб становішчы ўсёй нашай прамысловасьці, зробленага ім у сваёй прамове.

Завод на працягу доўгага часу знаходзіцца ў паласе вельмі буйных прарываў у выкананьні прамфінпляну, у палосе недахопаў і арганічных унутраных перакоў.

Пачынаючы ад заводакіраўніцтва, ад яго апэрацыйных аддзелаў і канчаючы кізавой адміністрацыяй у цэхах,—усюды панае бяладзьдзе ў рабоце і адсутнічае апэрацыйны плян.

Чым тлумачыць, што такая параўнаўча буйная адзінка, як завод «Чырвоны Мэталіст», больш-менш забясьпечаны сыравінай базай і дастатковай ўвагай з боку ўсёй рэспубліканскай прамысловасьці,—ня можа справіцца з выкананьнем ускладзеных на яго задач?

Аналіз прычын прыводзіць нас да выводу, што завод, маючы ўсе даныя для выкананьня свайго прамфінпляну, ня выконвае яго па тэй прычыне, што ня мог перабудаваць і прыстасаваць уцесь заводзкі арганізм стасоўна да тых новых гаспадарчых абставін, у якіх мы знаходзімся.

Пачнем з таго, што да сучаснага моманту завод ня мае свайго тварту. Ён не тыпазаваны. Па заданьнях выштэйстаячых арганізацый, завод штомесячна і нават часьцей перабудоўвае свой вытворчы працэс для зусім новых відаў прадукцыі. Гэтымі днямі,—11 ліпеня гг.—дзённая прадукцыя заводу налічыла 17 відаў яе. Вядомы выпадак, калі рабіліся буйнейшыя затраты на вытворчасьці такіх машын або дэталяй, якія гаспадарча не апраўдываліся, напрыклад, затрата 17.000 р. для вытворчасьці вельмі нялёўнай якасьці праполачнай машыны.

Белмэталяаб'яднаньне чамусьці стаіць на пункце гледжаньня ператварэньня заводу ў экспэрымэнтальны, забываючы пра тое, што ў межах БССР з яго вузкай мэталюргічнай базай, ператварэньне аднаго з буйнейшых заводаў у экспэрымэнтальны—вялікая раскоша. Мы ня выступаем супроць вопытных ці дасьледчых работ, якія трэба праводзіць на нашых заводах, але абсалютнае ператварэньне заводу ў вопытны ці нават жаданьне гэта зрабіць зусім не апраўдваецца сучасным становішчам на рынку сельска-гаспадарчых машын. Застаўляючы экспэрымэнтальныя работы за адпаведнымі дасьледчымі інстытутамі і заводамі (ВИСХОР), трэба заводу «Чырвоны Мэталіст» даць пэўную мэтавую ўстаноўку і тыпізацыю. Па нашаму глыбокаму перакананьню, завод павінен выпрацоўваць пэўную групу сельска-гаспадарчых машын, што дасьць магчымасьць наладзіць масавую сэрыйную вытворчасьць. Да гэтых машын можна прыкладна аднесьці: плугі розных марак, бароны, бульбакапалкі, машыны для ачысткі галовак лёну, сячкарні, карнарэзкі і г. д.

Вызначыўшы характар вытворчасьці на заводзе «Чырвоны Мэталіст», неабходна адпаведным арганізацыям заняцца тэхнічнай рэканструкцыяй гэтага заводу. Устарэлае абсталяваньне трэба паступова абнаўляць, асабліва гэта датычыцца такарнага цэху. Неабходна мэханізаваць некаторыя працэсы, а ў асаблівасьці падачу паўфабрыкатаў і матар'ялаў з аднаго цэху ў другі.

Прапрацоўваўшы праграму тэхнічнага абнаўленьня заводу, неабходна яшчэ больш сур'ёзна заняцца пытаньнем рэарганізацыі кіраўніцтва на самым заводзе. Самае сур'ёзнае мерапрыемтсва эканамічнага характару—гэта перавод на гаспадарчы разьлік цэхаў і замацаваньне гаспадарчага разьліку на ўсім заводзе. Вопыт, набыты ў заводакіраўніцтве па пытаньні аб пераходзе цэхаў на гаспадарчы разьлік, гаворыць за тое, што самым слабым месцам гаспадарчага разьліку зьяўляецца слабасьць рахункаводнага апарату і вучоты. Калі на заводзе абгаворвалі практычныя мерапрыемствы зьвязаныя з новымі ўмовамі працы, указаныя т. Сталіным на нарадзе гаспадарнікаў, то большасьць выступаўшых рабілі ўпор на недацэнчальную слабасьць цэхавага гаспадарчага разьліку. Цэхавыя адміністратары не навучыліся зьвязваць усяго агульна-заводзкага пляну з работай свайго цэху. Часамі выраб асобных дэталяй і паўфабрыкатаў утвараецца ў імя «вытворчасьці» наогул, але не для стварэньня зьвязанага працэсу заводзкага маштабу. Вось, нядаўна на прыкладзе вырабу бульбакапальнай машыны гэта пацьвердзілася. Ліцейны цэх не даваў камплектнасьці дэталяй, а адсюль усе астатнія цэхі не маглі справіцца з задачай зборкі машын.

Цэх да сучаснага моманту знаходзіцца ў ціскох гаспадарчай палахлівасьці, няма ініцыятывы. Бываюць выпадкі, калі гаспадарчы цэху спыняецца перад невялікай затратай, якая магла-б палепшыць выкананьне гаспадарчага пляну. Затое вельмі часта бывае наадварот, калі цэхавая адміністрацыя скарачае некалькіх чорнарабочых, думаючы гэтым самым, што яна ўтварае акт «рэжыму эканоміі». Вузлавыя пытаньні пераводу цэхаў на гаспадарчы разьлік і замацаваньня гэтага гаспадарчага разьліку зараз наступныя: спалучэньне заводзкага пляну з цэхавым, вялікая самадзейнасьць і ініцыятыва цэху, кантроль і вучот прадукцыі і, нарэшце, наладжваньне рахункаводна-бухгальтарскага апарату ў цэху.

Пераход на гаспадарчы разьлік магчымы тады, калі сур'ёзна завод займецца пераводам на гаспадарчы разьлік брыгад у першую чаргу найлепшых, а тады і ўсіх астатніх. Між тым, да сучаснага моманту ніводная брыгада яшчэ не пераведзена на пачатак гаспадарчага разьліку. 56 проц. складу рабочых не пераведзены на зьдзельшчыну.

Ня менш важным пытаньнем для заводу «Чырвоны Мэталіст» зьяўляецца пытаньне аб рабочай сіле, у прыватнасьці аб кваліфікаванай. Наяўны кантынгент рабочых, асабліва па такарнаму цэху бязумоўна недастаткова кваліфікаваны для выкананьня праду гаспадарчых заданьняў. Неабходна больш сур'ёзна паставіць пытаньне аб перападрыхтоўцы рабсілы на самым заводзе, а найталоўнейшае—гэта ліквідацыя блытаніны ў пытаньніх аплаты працы, ліквідацыя так званай «ўраўнілаўкі». На заводзе «Чырвоны Мэталіст» ёсьць факты, калі нізкаразрадныя рабочыя, дзякуючы няправільнай норме выпрацоўкі, паказвалі такі прыработак, што перавышалі заработак высока-аплачваемых рабочых. Вядучыя прафэсіі і прафэсіі цяжкай працы (выбаршчыкі, разьлівальшчыкі, калільшчыкі, токары і інш.) ня ставіліся ў асоба спрыяючыя ўмовы, ствараліся цякучасьць і незацікаўленасьць у рабоце. Высокакваліфікаваныя рабочыя працавалі «халадком», адсюль невыкананьне прамфінпляну і дрэнная якасьць прадукцыі. Ліквідацыя ўраўнілаўкі і ўпраздкаваньне ўсёй сыстэмы аплаты працы залежыць ад 2-х абставін: 1) Строгае разьмежаваньне разрадаў і. 2) Палепшаньне работы ТНБ.

Неабходна заводу «Чырвоны Мэталіст» у самым тэрміновым парадку заняцца пытаньнем заключэньня дагавору гаспадарчай уззамадапамогі з адным з калгасаў Віцебшчыны. Лічыць гаворыць аб тым, што менавіта з ліку некваліфікаваных рабочых назіраецца найбольшая цякучасьць. Так, напрыклад, за першы квартал 1931 г. і першыя 2 месяцы другога кварталу назіраўся наступны малюнак: прынята рабочых 234; выбыла рабочых 391. Гэта пры ўмове, калі завод адчувае патрэбу ў рабочай сіле. Маецца факт уцечкі. Замацаваць рабочых хоць-бы часова, калі яны вольны ад сельска-гаспадарчых работ можна тол

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і СНК БССР

пра абавязковыя пастановы раённых выканаўчых камітэтаў і саветаў і пра парадак накладаньня адміністрацыйных спагнаньняў

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

I.

ПРА ПАРАДАК ВЫДАНЬНЯ АБАВЯЗКОВЫХ ПАСТАНОЎ.

1. Раённыя выканаўчыя камітэты і гарадзкія саветы маюць права выдаваць абавязковыя пастановы толькі:

а) у галіне грамадзкага парадку і бясьпекі: пра парадак адчыненьня і дзейнасьці месц для відовішчаў і гульняў і прадпрыемстваў грамадзкага карыстаньня—гасьцініц, начлежных дамоў, лазьняў, цырульняў, сталовак, рэстаранаў, чайных; пра рэгуляваньне руху; пра адказнасьць за зьяўленьне на вуліцах і ў іншых публічных мясцох у п'яным відзе; пра ўстанаўленьне месц часу і парадку гандлю; пра парадак падпіскі зьмен у насельніцтве.

Проч таго гарадзкія саветы гарадоў Менску, Віцебску, Гомелю, Магілеву і Бабрусйску—пра абавязковае найманьне дворнікаў;

б) у галіне аховы здароўя: пра змаганьне з пошасьцямі, шалёнствам хатняй жывёлы і сацыяльнымі хваробамі; пра ўтрыманьне рэзьніц і спосабы рэзкі жывёлы; пра санітарнае ўтрыманьне вуліц, жылішчаў, двароў, школ, пральняў, вадаправодаў, студняў і прадпрыемстваў грамадзкага карыстаньня і па пытаньнях асэнізацыі;

в) у галіне народнае асьветы: пра ўсеагульнае абавязковае навучаньне;

г) у галіне дабрабыту: пра ачыстку дахаў, вуліц, двароў і тратуараў ад сьнегу; пра рамонт і ўтрыманьне ў парадку тратуараў, бруку, вадаправодаў і вадасьцёкаў; пра надворны рамонт будынкаў; пра супроцьпажарныя мерапрыемствы; пра ўстанаўленьне парадку карыстаньня вадою з прыватных студняў; пра асьвятленьне нумароў на фасадзе дамоў; пра асушку падвальных памяшканьняў;

д) у галіне змаганьня з стыхійнымі бедамі: пажарамі, паводкамі, завеямі і інш.;

е) у галіне будаўніцтва: пра будаўнічыя правілы, плянаваньне і забудаваньне паселішчаў;

ж) пра аховy лясоў, паркаў, сквэраў, садоў і зеляніны на вуліцах;

з) пра змаганьне з патравамі.

2. Местачковыя і сельскія саветы маюць права выдаваць абавязковыя пастановы:

а) у галіне аховы народнага здароўя; пра санітарнае ўтрыманьне вуліц, жылішчаў, школ, двароў, лазьняў, пральняў, студняў і месц гандлю;

б) у галіне дабрабыту: пра ачыстку дахаў, вуліц, двароў і тратуараў ад сьнегу; пра рамонт і ўтрыманьне ў парадку тратуараў, бруку і вадасьцёкаў; пра карыстаньне вадою са студняў; пра асьвятленьне нумароў на фасадзе дамоў; пра абсушку падвальных памяшканьняў;

в) у галіне змаганьня з стыхійнымі бедамі: пра мерапрыемствы супроць пажараў, пра змаганьне з паводкамі, завеямі і інш.;

г) пра аховy паркаў, сквэраў, садоў і зеляніны на вуліцах і пра меры папярэджаньня патраў.

3. Раённыя выканаўчыя камітэты, гарадзкія, местачковыя і сельскія саветы, апроч таго, выдаюць абавязковыя пастановы ў выпадках, прадугледжаных асобнымі пастановамі Ўраду СССР і БССР.

4. Абавязковыя пастановы раённых выканаўчых камітэтаў, гарадзкіх, местачковых і сельскіх саветаў не павінны супярэчыць пастановам вышэйшых органаў улады і ня могуць выдавацца па пытаньнях ўжо ўрэгуляваных вышэйшымі органамі ўлады.

5. У абавязковай пастанове павінна быць паказана: а) назва акту—«Абавязковая пастанова», б) назва ўстановы, якая яе выдае, в) дзень, месяц і год выданьня, а таксама чарговы нумар паводле спэцыяльнага пераліку абавязковых пастаноў, г) раён дзейнасьці абавязковай пастановы, а таксама пералік асоб, устаноў, прадпрыемстваў і арганізацый, на якія пашыраецца яе дзейнасьць, і дакладны пералік тых абавязкаў, што ўскладаюцца на насельніцтва данай тэрыторыі альбо на пасобныя ўстановы, прадпрыемствы ці арганізацыі;

д) характар і разьмер адказнасьці за невыкананьне альбо за парушэньне абавязковай пастановы;

е) пералік асоб і ўстаноў, на якія ўскладаецца нагляд за выкананьнем абавязковай пастановы і складаньне пратаколаў аб яе парушэньні;

ж) тэрмін, з якога абавязковая пастанова набывае сілу і тэрмін, на які яна выдаецца;

з) подпіс старшыні выканаўчага камітэту ці гарадзкога, местачковага і сельскага савету і сакратара.

6. Копіі абавязковых пастаноў неадкладна пасьля прыняцьця і да апублікаваньня іх пасылаецца пракурору раёну іх дзейнасьці, а таксама вышэйшаму камітэту ці савету.

7. Абавязковыя пастановы абвяшчаюцца праз публікацыю іх у мясцовым афіцыйным органе друку, калі ён выдаецца, і праз расклейку на відных мясцох, у спэцыяльных вітрынах, пры будынках раённых выканаўчых камітэтаў, гарадзкіх местачковых і сельскіх саветаў, хат-чытальняў, школ і інш. грамадзкіх будынкаў і набываюць сілу праз пяць дзён з дня іх апублікаваньня, альбо расклейкі, калі ў самой абавязковай пастанове не паказан пазьнейшы тэрмін.

Калі мерапрыемства, паказанае ў абавязковай пастанове, трэба правесьці тэрмінова, дык пастанова можа па пастанове органу, які яе выдае, набыць сілу з часу яе апублікаваньня альбо расклейкі.

8. Абавязковыя пастановы могуць выдавацца ня больш, як на адзін год.

9. Калі абавязковая пастанова будзе скасавана, зьменена альбо адпоўнена раней выхаду тэрміну, на які яна выдадзена, то выканаўчы камітэт альбо гарадзкі, местачковы і сельскі савет абвяшчаюць аб гэтым у парадку, паказаным у арт. 7 гэтае пастановы.

II.

ПРА ПАРАДАК НАКЛАДАНЬНЯ АДМІНІСТРАЦЫЙНЫХ СПАГНАНЬНЯЎ.

10. Адміністрацыйныя спагнаньні накладаюцца: а) за парушэньні, за якія пастановамі цэнтральных органаў улады ўстаноўлена адказнасьць у адміністрацыйным парадку, калі ў самым законе ці пастанове не паказан іншы орган, які павінен накладаць спагнаньні; б) за парушэньне абавязковых пастаноў раённых выканаўчых камітэтаў, гарадзкіх, местачковых і сельскіх саветаў.

11. За парушэньне абавязковых пастаноў могуць устанаўлівацца наступныя адміністрацыйныя спагнаньні: раённымі выканаўчымі камітэтамі і гарадзкімі саветамі—а) штраф да 100 рублёў і б) прымусовыя работы на тэрмін да 15 дзён; местачковымі і сельскімі саветамі—а) штраф да 10 руб. і б) прымусовыя работы ня больш як на 2 дні.

12. Калі абавязковая пастанова скасавана як незаконная, то ўсякія адміністрацыйныя спагнаньні павінны быць спынены, а штрафы вернуты.

13. За кожнае парушэньне абавязковых пастаноў, а таксама пастаноў цэнтральных органаў улады СССР і БССР, у якіх паказан адміністрацыйны парадак адказнасьці, органы міліцыі альбо іншыя службовыя асобы, упаўнаважаныя на гэта пастановаю, складаюць пратакол.

14. У пратаколе павінна быць паказана: а) калі і хто складае пратакол; б) імя, імя па бацьку і прозьвішча, век, сацыяльны стан парушніка і месца яго пражываньня; в) дзе, калі і ў чым дакладна выявілася парушэньне. У пратакол абавязкова павінны быць запісаны аб'ясьненьні асобы, якая прыцягваецца да адказнасьці ў адміністрацыйным парадку. Пратакол абавяшчаецца парушніку і падпісваецца ім, службовою асобаю, упаўнаважанаю на складаньне пратаколу і сьведкамі, калі яны ёсьць. Калі парушнік адмовіўся ад пад пісаньня пратаколу, дык матывы адмаўленьня павінны быць запісаны ў пратакол.

15. За парушэньне ў гарадох абавязковых пастаноў, якімі ўстаноўлены правілы пажарнай бясьпекі, парадак ў грамадзкіх мясцох і правілы руху на вуліцах, міліцыянэр мае права, без складаньня пратаколу, узяць на месцы парушэньня штраф у разьмеры да 3-х рублёў, аб чым павінен выдаць устаноўлены квіток.

Калі парушнік не заплоціць штрафу на месцы, дык аб парушэньні складаецца пратакол, які пасылаецца для накладаньня адміністрацыйнага спагнаньня ў агульным парадку.

16. Адміністрацыйныя спагнаньні за парушэньне абавязковых пастаноў на тэрыторыі местачковых і сельскіх саветаў накладаюцца гэтымі саветамі.

Калі па справах аб парушэньні абавязковых пастаноў раённага выканаўчага камітэту або гарадзкога савету, які вылучан у самастойную адміністрацыйна-гаспадарчую адзінку, сельскі савет палічыць недастатковым накладаньне спагнаньня ў разьмерах, якія паказаны ў арт. 11 гэтай пастановы (штраф да 10 рублёў, прымусовыя работы—да 2-х дзён), ён накіроўвае справу ў адпаведную камісію на накладаньні адміністрацыйных спагнаньняў пры раённых выканаўчых камітэтах або гарадзкіх саветах.

17. Адміністрацыйныя спагнаньні за парушэньне абавязковых пастаноў на тэрыторыі гарадоў накладаюцца камісіямі ў складзе 3-х асоб, якія ўтвараюцца пры гарадзкіх саветах.

Старшынёй камісіі назначаецца начальнік гарадзкога кіраўніцтва міліцыі альбо яго намесьнік. У тых гарадох, дзе няма гарадзкога кіраўніцтва міліцыі, старшынёй камісіі назначаецца член прэзыдыуму гарадзкога савету.

Членамі камісіі назначаюцца члены гарадзкіх саветаў, а там дзе ёсьць пры гарадзкіх саветах адміністрацыйна-прававыя сэкцыі—члены гэтых сэкцый. Пэрсанальны склад камісій зацьвярджаецца прэзыдыумамі гарадзкіх саветаў.

18. Адміністрацыйныя спагнаньні за парушэньне пастаноў цэнтральных органаў улады СССР і БССР, калі ў іх паказана адміністрацыйная адказнасьць, накладаюцца ў разьмерах, паказаных у гэтых пастановах: за парушэньні, зробленыя ў гарадох, якія выдзелены ў самастойныя адміністрацыйна-гаспадарчыя адзінкі і на тэрыторыі сельскіх саветаў у гарадзкой мяжы гарадоў—камісіямі, паказанымі ў арт. 17 гэтай пастановы, а за парушэньні, зробленыя на тэрыторыі іншых гарадоў, мястэчак і сельскіх саветаў,—камісіямі з 3-х асоб, якія арганізуюцца пры раённых выканаўчых камітэтах.

Калі ў пастанове разьмер спагнаньня не паказан, дык спагнаньне накладаецца ў разьмерах, паказаных у арт. II гэтай пастановы.

У склад камісіі пры раённым выканаўчым камітэце ўваходзіць начальнік раённага кіраўніцтва міліцыі (старшыня) і члены раённага выканаўчага камітэту.

Пэрсанальны склад камісіі зацьвярджаецца прэзыдыумам раённага выканаўчага камітэту.

19. Калі ў адпаведнай пастанове, апроч адміністрацыйнага спагнаньня, прадугледжана канфіскацыя маёмасьці, сродкаў, або забароненых вырабаў, зачыненьне ці зьнясеньне пабудоў, дык аб гэтым робіцца пастанова адначасова з пастановаю аб налажэньні спагнаньня.

20. Адміністрацыйныя спагнаньні накладаюцца паводле наступных правілаў:

а) аб накладаньні спагнаньня запісваецца пастанова, ў якой паказваецца час яе складаньня, асоба або ўстанова, якая складае пастанову, імя, імя па бацьку і прозьвішча парушніка, сацыяльнае становішча яго, разьмер сельскагаспадарчага падатку, калі парушнік селянін, адзначэньне таго, што было зроблена парушнікам і разьмер штрафу;

б) калі да вызначэньня адміністрацыйнага спагнаньня справа ўжо была прынята да разгляду судом, дык спагнаньне ў адміністрацыйным парадку не накладаецца;

в) пастанова аб накладаньні спагнаньня павінна быць вынесена не пазьней як праз 10 дзён ад дня атрыманьня пратаколу. Парушніку неадкладна пасылаецца копія пастановы з паказаньнем тэрміну і парадку яе абскарджаньня.

21. З дня атрыманьня парушнікам копіі пастановы аб накладаньні адміністрацыйнага спагнаньня яму даецца 5 дзён для дабравольнай выплаты штрафу, а калі гэты тэрмін зыйдзе, а парушнік не заплаціць штрафу, дык штраф спагнаецца прымусовым парадкам праз апісаньне і продаж маёмасьці з захаваньнем правіл, паказаных у Грамадзянскім Працэсуальным Кодэксе.

Пры прымусовым спагнаньні штрафаў, накладзеных у адміністрацыйным парадку на рабочых і служачых, для выплаты штрафу ня можа брацца заработная плата.

22. Адміністрацыйнае спагнаньне можа быць назначана толькі на працягу двох месяцаў ад дня парушэньня. Калі гэты тэрмін прапушчан, дык справа аб парушэньні спыняецца.

Пастанова аб адміністрацыйным спагнаньні выконваецца на працягу ня больш двох месяцаў. Пасьля выходу гэтага тэрміну выкананьне пастановы аб адміністрацыйным спагнаньні спыняецца.

23. Устанавіць адказнасьць у адміністрацыйным парадку і за наступныя парушэньні:

а) за няплату паасобнымі грамадзянамі ўпяршыню ва ўстаноўлены тэрмін падаткаў альбо збораў па абавязковым акладным страхаваньні, калі ёсьць магчымасьць заплаціць іх і калі ўжыты адміністрацыйныя меры для іх спагнаньня;

б) за адмаўленьне ўпяршыню паасобных грамадзян ад выкананьня агульнадзяржаўных павіннасьцяй і работ;

в) за выраб, збыт, куплю альбо захаваньне, без належнага дазволу, агнястрэльнай зброі невайсковага ўзору і агнястрэльных набояў да яе, пры гэтым незаконна здабытая зброя і агнястрэльныя набоі да яе канфіскуюцца;

г) за невыкананьне альбо парушэньне на будаўнічых работах устаноўленых пастановамі органаў улады будаўнічых, санітарных альбо супроцьпажарных правіл, калі гэтыя дзеяньні ня мелі цяжкіх вынікаў;

д) за непадпарадкаваньне ва ўстаноўлены тэрмін старшынямі кіраўніцтваў каапэрацыйных таварыстваў і працоўных арцеляў і іх аб'яднаньнямі, прадстаўнікамі ўсялякіх таварыстваў, якія маюць гандлёва-прамысловыя мэты, а таксама паасобнымі прадпрыемствамі вестак аб рабоце прадпрыемстваў, іх прадукцыйнасьці, зьменах у асабовым складзе таварыстваў і інш., паводле ўстаноўленых цэнтральнаю і мясцоваю ўладаю правіл і форм;

е) за парушэньне законаў і правіл аб гандлі і прамысловасьці, калі за парушэньні іх устаноўлена адказнасьць у адміністрацыйным парадку;

ж) за самавольную парубку ў лясох агульнадзяржаўнага і мясцовага значэньня, а таксама за парушэньне правіл для аховы лясоў ад крадзяжу і зьнішчэньня, калі разьмер шкоды ад гэтых дзеяньняў, вылічаны паводле правіл вылічэньня страт ад лесапарубак, устаноўленых Народным Камісарыятам Земляробства, не перавышае пяцьдзесят рублёў; пры гэтым незаконна здабыты лес канфіскуецца;

з) за выраб, захаваньне і збыт самагону, а таксама за выраб, за хаваньне рамонт і збыт апаратаў, якія спэцыяльна на прызначаны для вырабу самагону, апроч выпадкаў, прадугледжаных арт. арт. 149 і 150 Крымінальнага Кодэксу, пры чым знойдзены самагон і апараты канфіскуюцца;

і) за наяўку ў тэрмін у вызначанае судовымі альбо адміністрацыйнымі органамі месца пражываньня і за самавольнае часовае пакіданьне гэтага месца, а таксама за невыкананьне асобамі, высланымі ў судовым альбо адміністрацыйным парадку, установленых правіл рэгістрацыі такіх асоб;

к) за карыстаньне чужымі дакумантамі для рэгістрацыі ў адрасных сталох альбо для пасьведчаньня сваёй асобы перад органамі ўлады;

л) за нашэньне асобамі, якія ня маюць на гэта права, установленай форменнай вопраткі, а таксама ўстаноўленых адзнак, апроч паказаных у арт. 114 Крымінальнага Кодэксу.

м) за парушэньне правіл аб парадку адчыненьня і эксплёатацыі друкарняў, літаграфій і іншых паліграфічных прадпрыемстваў, а таксама майстэрняў, якія займаюцца вырабам эмблемаў, штампаў, адзнак і падобнага да іх;

н) за парушэньне правіл, устаноўленых для размножаньня і выпуску ў сьвет надрукаваных твораў, а таксама правіл фота-кіна-цэнзуры;

о) за будаваньне прыватнай прымальнай і перадатачнай радыёстанцыі без належнай рэгістрацыі альбо даводу, а таксама за карыстаньне такой радыёстанцыяй без аплаты абанемэнтаў, альбо з парушэньнем правіл карыстаньня і правіл кантролю;

п) за парушэньне альбо перашкоду рэлігійнымі абрадамі альбо культавымі цэрамоніямі вольнасьці руху іншых грамадзян наперакор закону ці загаду органаў улады;

р) за паданьне неправільных вестак у заявах, якія падаюцца ў дзяржаўныя ўстановы ці службовым асобам ва ўстаноўленых законам выпадках, калі рэгіструюцца альбо адчыняюцца гандлёва-прамысловыя прадпрыемствы і ўстановы, жыльлёвыя і іншыя таварыствы.

с) за распачацьце дзейнасьці таварыстваў і аб'яднаньняў да зацьверджаньня альбо рэгістрацыі іх статутаў і нагул з парушэньнем устаноўленага законам парадку;

т) за зьнішчэньне, псаваньне, зьняцьце альбо перамяшчэньне знакаў, якія ўжываюцца пры вядзеньні здымальных, астранамічна-гэадэзычных і нівеліровачных работ (слупы раённых і гарадзкіх меж, рэперы, піраміды і інш.), а таксама за пастаноўку новых такіх знакаў там, дзе яны не павінны быць.

III.

ПРА ПАРАДАК АБСКАРДЖАНЬНЯ ПАСТАНОЎ АБ НАКЛАДАНЬНІ АДМІНІСТРАЦЫЙНЫХ СПАГНАНЬНЯЎ.

24. Скаргі на пастановы аб накладаньні адміністрацыйнага спагнаньня могуць падавацца на працягу пяці дзён ад дня ўручэньня копіі пастановы аб спагнаньні.

Падача скаргі на пастанову аб накладаньні адміністрацыйнага спагнаньня прыпыняе выкананьне пастановы да разгляду скаргі.

Скарга павінна быць разгледжана на працягу пяці дзён.

25. Калі адміністрацыйнае спагнаньне было накладзена местачковым альбо сельскім саветам, дык скаргі на іх пастановы падаюцца праз савет, які налажыў спагнаньне, у раённы выканаўчы камітэт.

Калі адміністрацыйнае спагнаньне было накладзена камісіямі пры гарадзкіх саветах, дык скаргі падаюцца праз камісію ў адпаведны гарадзкі савет.

Скаргі на пастановы камісій пры раённых выканаўчых камітэтах падаюцца праз камісію ў адпаведны раённы выканаўчы камітэт.

26. Орган, які атрымаў скаргу на сваю пастанову аб адміністрацыйным спагнаньні, павінен на працягу трох дзён падаць яе з ўсёю справаю ў прэзыдум раённага выканаўчага камітэту ці гарадзкога савету па належнасьці і пры гэтым можа дадаць сваё тлумачэньне па зьместу скаргі.

27. Прэзыдыум раённага выканаўчага камітэту ці гарадзкога савету павінен разглядзець скаргу на пастанову аб адміністрацыйным спагнаньні на працягу пяці дзён з часу атрыманьня скаргі; ён можа гэтую пастанову зацьвердзіць, зьмяніць, скасаваць альбо зьвярнуць справу для перагляду.

Пастановы прэзыдыуму раённага выканаўчага камітэту ці гарадзкога савету лічацца канчатковымі.

28. Службовыя асобы за злоўжываньні і за перавышэньне ўлады пры накладаньні адміністрацыйнага спагнаньня прыцягваюцца да адказнасьці паводле арт. арт. 196, 197 і 198 Крымінальнага Кодэксу БССР.

IV.

29. З часу выданьня гэтай пастановы скасаваць пастанову ЦВК і СНК БССР за 17 мая 1928 г. «Пра парадак выданьня акруговымі і раённымі выканаўчымі камітэтамі і гарадзкімі саветамі абавязковых пастаноў і пра накладаньне адміністрацыйных пакараньняў за іх парушэньне» з усімі яе зьменамі (З.З. БССР 1928 г., № 17, арт. 160; 1929 г., № 11, паст. 59 і № 26, паст. 154).

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР Грысевіч.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР М. Гілякевіч.

15 мая 1931 г.

г. Менск.

Пастанова Эканамічнага Савету БССР

пра забясьпечаньне школ падручнікамі

Выслухаўшы даклад Народнага Камісарыяту Асьветы пра ход забесьпячэньня школ падручнікамі да пачатку 1931-32 навучальнага году, Эканамічны Савет БССР пастанаўляе:

1. Прапанаваць усім раённым выканаўчым камітэтам і гарадзкім саветам пад адказнасьць іх старшынь да 15-га ліпеня г. г. заключыць дагаворы з аддзяленьнямі Белкалгассаюза аб забесьпячэньні школ падручнікамі і навучальнымі прыладамі, выходзячы, у адносінах да падручнікаў, з каэфіцыэнту, які ўстаноўлен Народным Камісарыятам Асьветы.

2. Прапанаваць Белкаапсаюзу на працягу дэкады забраць з Белдзяржвыдавецтва і разаслаць усе падручнікі, якія зараз ёсьць на складзе Белдзяржвыдавецтва, а таксама рассылаць на працягу трох дзён з дня выпуску з друку падручнікі па раёнах. Даручыць раённым выканаўчым камітэтам і гарадзкім саветам, пад адказнасьць іх старшынь, перавесьці не пазьней як праз тры дні аддзяленьням Белкаапсаюзу сродкі на набыцьцё падручнікаў і на працягу двух дзён з дня атрыманьня падручнікаў на месцох даваць аддзяленьням Белкаапсаюзу разьмеркаваньне падручнікаў па школах.

3. Даручыць Белкаапсаюзу прапанаваць сваім аддзяленьням на месцох на працягу двох дзён па меры выкупу падручнікаў рассылаць іх па школах, для чаго зараз-жа распрацаваць мерапрыемствы па тэхніцы дастаўкі.

4. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам і гарадзкім саветам, пад адказнасьць іх старшынь, усе сродкі, якія вызначаны па каштарысу на падручнікі і навучальныя прылады, скарыстоўваць толькі па прамым іх прызначэньні.

5. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Фінансаў забясьпечыць своячасовае і поўнае асигнаваньне сродкаў на выкуп падручнікаў і кантраляваць іх мэтавае скарыстоўваньне.

6. Прапанаваць прэзыдыуму Белкаапсаюзу не пазьней як праз пяць дзён забясьпечыць патрэбнымі лімітамі райспажыўсаюзы на прадмет бесьперабойнай аплаты падручнікаў і прылад, пры значаных для забесьпячэньня школ да новага навучальнага году.

7. Бяручы пад увагу, што недахват тары ў Белдзяржвыдавецтве затрымлівае адпраўку падручнікаў у раёны, пра панаваць Белдзяржбанку своячасова выканаць дагаворы, якія заключаны з Белдзяржвыдавецтвам на дастаўку цьвёкоў.

Аргтары ўжыць адпаведныя мерапрыемствы да недапушчэньня зрыву своячасовай пасылкі падручнікаў у раёны з-за тары.

8. Усім РВК зараз-жа разгарнуць работу ва ўдарным парадку па мабілізацыі сродкаў грамадзкіх арганізацый і насельніцтва на выкуп падручнікаў.

9. Прапанаваць Цэнтрвыдату ўжыць рашучыя захады па тэрміновым выпуску з друку падручнікаў на нацыянальных мовах.

Старшыня Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР М. Галадзед.

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР С. Кандыбовіч.

7 ліпеня, 1931 г.
гор. Менск.

НОВЫЯ ХЛЕБАЗАВОДЫ Ў БССР

Цэнтрасаюз адпускае ў трэцім квартале на разьвіцьцё і палепшаньне хлебапячэньня на заводах новабудоўлях БССР 895 тысяч рублёў.

У першую чаргу будзе закончана будаўніцтва хлебазаводу ў Барысаве, Полацку, з прапускной здольнасьцю 37 тон у суткі кожны. Далей будзе прыступлена да пабудовы новых хлебазаводаў у Магілеве з прапускной здольнасьцю ў 40 тон, у Мазыры і Воршы—30 тон хлеба ў суткі кожны. (ТАСС).

Усеукраінская яўрэйская капэля ў Менску

Зараз у Менску працуе Ўсеўкраінскі яўрэйскі вакальны ансамбль—капэля «ЕВОКАНС», пад мастацкім кіраўніцтвам кампазытара Е. Шэйніна.

«ЕВОКАНС» арганізаваўся толькі 2 гады назад па ініцыятыве Кіеўскага гарпрафсавету з мэтай стварэньня яўрэйскай капэлі для папулярызацыі яўрэйскай песьні сярод шырокіх працоўных мас яўрэйскай і інш. нацыянальнасьцяй СССР. Капэля складзена з рабочых прадпрыемстваў Украіны і сьпевакоў прафэсыяналаў.

З першых-жа сваіх крокаў капэля стала перад дзьвюма цяжкасьцямі, якія неабходна было абавязкова пераматчы таму, што ў адваротным выпадку нельга было б ісьці па шляху стварэньня пралетарскай яўрэйскай песьні. Гэтымі цяжкасьцямі зьяўляліся: **па-першае**, адсутнасьць адпаведнага рэпэртуару, **па-другое**,—задача перавыхаваньня слухача.

Да апошняга часу яўрэйскія песьні выконваліся толькі індывідуальнымі сьпевакамі і адзінкавымі квартэтамі, пры чым рэпэртуар гэтых выканаўцаў складаўся, у сваёй большасьці, з старых дробна-буржуазных местачковых і хасідзкіх сьпеваў.

Перад капэляй сталі дзьве задачы—**стварыць новы савецкі рэпэртуар і перавыхаваць слухача.**

Як-жа капэля справілася з гэтымі задачамі? Канцэрты капэлі ў Менску паказваюць, што пераважная большасьць выконваемых рэчаў цалкам адпавядае запатрабаваньням стварэньня яўрэйскай песьні нацыянальнай па форме і пралетарскай па зьмесьце.

Шляхам прыцягненьня да ўдзелу ў сваёй рабоце новых, савецкіх кампазытараў і дзякуючы надзвычайна добраму мастацкаму кіраўніцтву дырыжэра Шэйніна капэлі ўдалося справіцца з пастаўленай перад сабой задачай. Трэба адзначыць вельмі арыгінальны шлях, па якім пайшла капэля для перавыхоўваньня слухача. Пакідаючы ў аснове музыкі народны калёрыт і апрацоўваючы яго апошнімі дасягненьнямі музычнай тэхнікі тав. Шэйніну ўдалося дасягнуць таго, каб слухач паступова выхоўваўся, навучыўся разумець новую сучасную музыку.

У рэпэртуары капэлі ня толькі яўрэйскія, але і украінскія, беларускія, малдаванскія, расійскія і інш. песьні, што робіць яе не замкнутым нацыянальным калектывам, а інтэрнацыянальным.

Гаворачы аб выкананьні рэпэртуару неабходна адзначыць, надзвычайна добрую падачу музычнай фразы, багатай рытмікі і вельмі вытрыманай дысцыплінаванасьці ўсяго калектыву. Вельмі няжка оказаць, якія рэчы выконваюцца лепш. Але ўсё-ж ткі неабходна спыніцца на сьпеве пра чырвоны паветраны флёт («Цудоўны флёт», муз. Казіцкага), які вельмі мастацка, рытмічна перадае палёт самалёту, шум прапэлеру, які агітуе за савецкую авіяцыю. З вялікім узлымам, пакідаючым надзвычайна добрае ўражаньне, выконвае капэля сьпеў «Пяцігодка за чатыры гады»—Шэйніна, «Кастрычнік» (кантата)—Шэйніна, беларускую песьню «Ой рана на Івана»—Прохарава, малдаўскую песьню «Пастушок» і інш.

Канцэрты «ЕВОКАНС'а» ў Менску лішні раз сьцьвярджаюць, што ён цалкам апраўдаў атрыманую ім на першай Ўсеўкраінскай музычнай алімпіядзе назву капэлі першай катэгорыі і з гонарам апраўдвае назву ўдарнай імя першай Ўсеўкраінскай музычнай алімпіяды.

С. Громаў.

Двухдэкаднік скончыўся, а дабрабыт Менску бяз зьмен

18-га ліпеня г. г. адбылося пашыранае паседжаньне гарадзкой кройкі разам з прадстаўнікамі ЖАКТаў і іншых арганізацый па правядзеньні двухдэкадніка ўпарадкаваньня дабрабыту Менску. На гэтым паседжаньні быў за слухан даклад начальніка абазову тав. Баранава аб становішчы асэнізацыйнага абозу.

На сёньняшні дзень звароты асабозу значна павялічыліся. У зьвязку з гэтым неабходна павялічыць цягавую сілу. Але пры такіх бестаспадарчых адносінах, якія наглядаюцца з боку кіраўніцтва асабозам, цягавая сіла, ў даным выпадку коні, доўга працаваць ня могуць. Зараз на кожнага каня даецца 5 кілё аўса і некалькі фунтаў... гнілога сена. Такі «дагляд» жывёлы з рук вон дрэнны.

Такі «дагляд» даў адпаведныя вынікі: нядаўна асабоз купіў 50 коняй па 500 руб. кожны, але на сёньняшні дзень кошт кожнага каня не перавышае 50 руб.

Кіраўніцтва асабозам не паклапацілася нават аб тым, каб своячасова набыць сенажаці.

Неабходна часткова мэханізаваць асэнізацыйны абоз.

Апроч гэтага, тройка адзначыла, што дрэнна абстаіць справа з каналізацыяй. Напрыклад, вуліца Карла Маркса ўся раскопаная, пакладзены падземныя трубы, але за адсутнасьцю некаторых частак дамы на гэтай вуліцы ня ўключаны ў каналізацыю

Тройка прызнала, што двухдэкаднік праведзены неадвальняючы. Работнікі, якія кіравалі правядзеньнем двухдэкадніка, да работы аднесьліся нядбайна.

Тройка вынесла памоцнику начальніка гаспраўчага дому т. Дубініну і нач. асабозу тав. Баранаву. Гэтым тэрмінам прапанавана, каб да 1-га жніўня давесьці колькасьць бочак да 50 штук.

Другім пытаньнем тройка разгледзела работу па раскопках менскіх вуліц. Тройка прызнала, што раскопка вуліц ідзе анархічным парадкам: дзе хто хоча, той там і капае. Напрыклад, на Пляцу Волі ўтварылі раскопку бяз ведама камгасу, у той час калі гэтага не павінна быць.

Ня гледзячы на тое, што ёсьць пастанова, каб вуліцы Савецкая і Карла Маркса былі гатовы для брукаваньня да 15-га чэрвеня,—гэтыя вуліцы яшчэ не гатовы і на сёньняшні дзень,—на 21-га ліпеня.

Наглядаюцца выпадкі, калі адна і тая-ж вуліца перакопваецца па 2-3 разы, што зьяўляецца калі ня простым злачынствам, дык абураючым галанцяцтвам. Дрэнна і тое, што пры выкапаных ямах няма сыгнальных ліхтароў, што можа прывесьці да калецтва жывёлы і чалавека. Гэта неабходна ўлічыць у далейшым.

На сёньняшні дзень тройка яшчэ ня мае плянаў па раскопваньні і пракладцы вуліц.

Выходзячы з гэтага тройка катэгарычна прапанавала пасобным спэцыялістам трымаць шчыльную сувязь і падпарадкавацца Камгасу ў складаньні плянаў і ўтварэньні работ.

Трэцім пытаньнем разглядалася забясьпечаньне асфальтам работ па пракладцы і рамонце тратуараў. Усяго асфальту патрэбна 30 вагонаў, а мэцца 5. Маючыйся асфальт дасьць магчымасьць пракласьці тратуары толькі па Савецкай вуліцы ад вуліцы Урыцкага да вуліцы Энгельса.

12 вагонаў асфальту ў хутчэйшы часе павінна прыбыць, а пра астатнія нічога невядома.

На нарадзе была высунута прапанова аб тым, каб прыгатаўляць асфальт на месцы. Для гэтага неабходна трывесьці з Крычава інфузорную зямлю і з Баку—нафтавыя батумы. Гэтыя прылады і матар'ял хутчэй можна набыць, чым прывесьці гатовы асфальт. Мы лічым, што гэта пытаньне незбходна вырашыць і вырашыць мэтазгоднасьць і магчымасьць аказаньня прапановы аб прыгатаваньні асфальту ў Менску.

Тройка павінна зрабіць найхутчэйшую праверку выкананьня сэкіх пастаноў.

М. Варанецы.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

Мендзяржтэатр

СЁНЬНЯ гастроль расійскай опэры пад кіраўніцтвам Я. Е. Воўкава

ФАУСТ музыка ГУНО

Пачатак а 8 з паловай гадз.

Білеты ў раб. касе з 12-2 і з 4-6 г. У касе тэатру з 12-2 і з 5-9 гадз. увеч.

Дзяржцырк

Пачатак гастроляў нямецкага ўкраіцеля ЛАЦІ

З яго групай бэрбэрыйскіх ЛЬВОЎ

Працяг гастролай аўтамат-лялька—ФРАЗО Паветраны палёт Валенціні

Апошнія дні прыгучых—гальтамарталістаў Донвальдзі і шмат іншых нумароў

Пачатак а 8 гадз. 45 хв. увечары.

Льготныя білеты ў рабкасе

Дом культуры

Гастролі 1-га Дзяржаўнага Польскага Тэатру Украіны

2 СІЛЫ 2

У 4-х дзеях. Пачатак а 8 з пал. г.

Білеты ў рабкасе, а ў дзень спэктаклю ў доме культуры з 5 гадз.

Прымаюцца заяўкі на цэлевыя спэктаклі.

Кіно „Інтэрнацыянал"

Ад 21 ліпеня М. Ю. Лермантаў на экране

Герой нашага часу КНЯЖНА МЭРЫ

Пачатак а 7 гадзіне. Каса а 5 гадз.

Кіно „Пралетары"

ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ

ЖОНКА ДОКТАРА БРЫАНА

Пачатак а 2, 3-45, Вяч. а 7, 8-45 і 10-30 г.

„Чырвоная Зорка"

ПЕРШЫ ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ

ПУЦЁЎКА У ЖЫЦЬЦЁ

Драма ў 34 эпізодах

Заняткі ва Ўсебеларускім палітыка-асьветным тэхнікуме (Магілеў н./д.)

ПАЧНУЦЦА 1-га ЖНІЎНЯ

Студэнты, якія своячасова не зьявяцца на заняткі, а таксама арганізацыі, якія іх затрымаюць, будуць прыцягнуты да партыйнай, комсамольскай і адміністрацыйнай адказнасьці.

Дырэктар П. Капаевіч

—Мендзяржкіно напамінае, што—

з 1-VIII, водпуск усіх кіно-карцін кінаўстаноўкам, якія не заключаць да гэтага часу дагавораў на плянавае снабжэньне кіно-карцінамі, будзе СПЫНЕНЫ

Заключэньне дагавораў праводзіцца ад 23 па 30 ліпеня ад 9 да 12 г. дня

Пры заключэньні дагавору трэба мець з сабою пасьведчаньне, якое ўпаўнаважвае загадчыка кінаўстаноўкі на заключэньне дагавораў і пачатку арганізацыі, якой належыць кінаўстанаўка

МЕНДЗЯРЖКІНО

КУРСЫ СЦЭНАРЫСТЫХ ПРЫ БЕЛДЗЯРЖКІНО

арганізуюць

кансультацыю для ўсіх цікавячыхся сцэнарнай справай і жадаючых пісаць сцэнары для кіно-фільмаў

Кансультацыя ўтвараецца пачынаючы з 12 ліпеня з 5 гадз. 30 хвілін да 7 гадз. увечары па наступным лікам:

12, 13, 15, 18, 19, 22, 24, 25, 28, 30 у памяшканьні 25 школы імя Чарвякова (Савецкая, 44)

БЕЛДЗЯРЖКІНО

Да ведама ўсіх

НАРКАМАТАЎ і ГАСП